МІНІСТЭРСТВА СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ
І ХАРЧАВАННЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ГАЛОЎНАЕ ЎПРАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ, НАВУКІ І КАДРАЎ

Установа адукацыі
"БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ
СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЯ АКАДЭМІЯ"

Кафедра гісторыі і педагогікі

*Г. А. Гусарава, А. М. Куніцкая*

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ Ў КАНТЭКСЦЕ ЕЎРАПЕЙСКАЙ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

*Матэрыялы для самастойнай працы*
*для студэнтаў усіх факультэтаў завочнай формы навучання*

Горкі
БДСГА
2016

УДК 94(476)(072)
ББК 63.3(4Беи)я73
Г96

*Рэкамендавана метадычнымі камісіямі*
*факультэта эканомікі і права 25.01.2016 (пратакол № 5)*
*і інжынернага факультэта 26.01.2016 (пратакол № 1)*

Аўтары:
кандыдат гістарычных навук, дацэнт *Г. А. Гусарава*;
старшы выкладчык *А. М. Куніцкая*

Рэцэнзенты:
кандыдат гістарычных навук, дацэнт *Н. А. Глушакова*;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт *В. А. Сідарава*

**Гусарава, Г. А.**
Г96 Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі : матэрыялы для самастойнай працы для студэнтаў усіх факультэтаў завочнай формы навучання / Г. А. Гусарава, А. М. Куніцкая. – Горкі : БДСГА, 2016. – 64 с.

Прыведзены парады па арганізацыі самастойнай працы, характарыстыка важнейшых падзей, знакамітых дзеячаў, асноўных характэрных тэрмінаў і паняццяў, вытрымкі з гістарычных дакументаў.
Для студэнтаў усіх факультэтаў завочнай формы навучання.

**УДК 94(476)(072)**
**ББК 63.3(4Беи)я73**

© УА “Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія”, 2016

## ПРАДМОВА

Адукацыйны стандарт Рэспублікі Беларусь прадугледжвае разам з навучаннем па абранай спецыяльнасці далейшае паглыбленне гуманітарных і грамадазнаўчых ведаў. Асноўныя мэты сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі – фарміраванне і развіццё сацыяльна-асабістых кампетэнцый, прафесійных ведаў і практычных навыкаў, неабходных для вырашэння і выканання грамадскіх, сацыяльна-прафесійных і асабістых задач і функцый. Састаўной часткай сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі з'яўляецца курс "Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі".

Гісторыя народа – гэта працяг мінулага, якое насычана рэальнымі справамі сучаснага, і пасланне грамадства ў будучыню. Толькі павага да сваёй гісторыі, нацыянальных каштоўнасцей і традыцый з'яўляецца асновай росквіту краіны. Толькі гісторыя народа можа растлумачыць яго патрэбы і ідэалы.

Задача вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі" ва ўстановах вышэйшай адукацыі заключаецца ў набыцці студэнтамі практычных навыкаў аналізу гістарычных фактаў і падзей, што з'яўляецца тэарэтыка-метадалагічнай асновай, неабходнай для якаснай падрыхтоўкі спецыялістаў.

У выніку вывучэння курса "Гісторыі Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі" студэнты павінны **ведаць:**

– асноўныя тэорыі грамадскага развіцця, асаблівасці фармацыйнага і цывілізацыйнага падыходаў да вывучэння гісторыі Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі;

– асноўныя этапы складвання беларускага этнасу ў асобныя гістарычныя перыяды;

– гістарычныя мадэлі мадэрнізацыі грамадства і дзяржавы, савецкі варыянт мадэрнізацыі і цывілізацыйнага развіцця беларускага грамадства;

– дасягненні ў развіцці матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа;

– этапы развіцця дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі, станаўленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь;

– месца і ролю беларускіх земляў у геапалітычных працэсах у асобныя гістарычныя перыяды, уклад беларускага народа ў перамогу

над фашызмам, значэнне і месца суверэннай Рэспублікі Беларусь у сучасным свеце;

**умець:**

– выкарыстоўваць фармацыйны і цывілізацыйны падыходы да вывучэння гісторыі для характарыстыкі асаблівасцяў гістарычнага развіцця беларускага народа;

– характарызаваць умовы і вынікі складвання беларускага этнасу ў асобныя гістарычныя перыяды;

– ажыццяўляць параўнальны аналіз рэформ і рэвалюцый у працэсе мадэрнізацыі беларускага грамадства, ацэньваць вынікі функцыянавання савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў БССР, вызначаць сутнасныя характарыстыкі беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця;

– тлумачыць уплыў асобных культурна-цывілізацыйных фактараў на развіццё Беларусі і ацэньваць асноўныя дасягненні ў развіцці матэрыяльнай і духоўнай культуры Беларусі; выкарыстоўваць культурна-гістарычную спадчыну Беларусі ў сваёй прафесійнай дзейнасці і памнажаць яе;

– аналізаваць працэс утварэння беларускай дзяржаўнасці, афармлення і замацавання суверэнітэту Рэспублікі Беларусь;

– характарызаваць геапалітычнае становішча беларускіх зямель у асобныя гістарычныя перыяды, ацэньваць значэнне Перамогі савецкага народу ў Вялікай Айчыннай вайне, аналізаваць месца і ролю суверэннай Рэспублікі Беларусь ва ўмовах сусветнай глабалізацыі.

Дадзенае метадычнае выданне прызначана для студэнтаў усіх факультэтаў завочнай формы навучання Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі і прызвана дапамагчы ім лепш асэнсаваць тэарытычны матэрыял. Абагульненне разнастайнай інфармацыі і прадстаўленне яе ў выглядзе кароткага канспекта, рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай працы, вылучэнне характэрных гістарычных паняццяў, асноўных падзей і знакамітых асоб накіраваны на тое, каб зрабіць падрыхтоўку да семінараў і залікова-экзаменацыйнай сесіі больш рацыянальнай і паспяховай.

# АРГАНІЗАЦЫЯ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ

## Як працаваць на лекцыях

Лекцыя – адзін з важнейшых відаў вучэбных заняткаў у ВНУ, калі пэўныя веды перадаюцца студэнтам ад выкладчыкаў у вуснай форме. Лекцыя дае сістэматызаванае ўяўленне аб вывучаемым курсе, адлюстроўвае ўсё тое каштоўнае і новае, што ёсць у дадзенай навуцы на сённяшні дзень. Лекцыя – гэта творчы працэс, у якім удзельнічаюць лектар і слухачы. Лектар не толькі інфармуе, але і вучыць лагічна думаць, лаканічна і прыгожа выкладаць матэрыял.

Слуханне лекцыі – гэта творчая і даволі нялёгкая праца. Яна пачынаецца з мэтанакіраванай канцэнтрацыі ўвагі. Слухаць лекцыю трэба ўважліва, засяроджана, каб зразумець навуковую сутнасць тэмы, яе сувязь з жыццём, асэнсаваць сфармуляваныя законы і паняцці навукі, прыведзеныя факты, доказы, аргументацыю выдзеленых палажэнняў.

Важна навучыцца вылучаць і запісваць галоўныя падзеі, факты, высновы і абагульненні. Найбольш мэтазгодным з’яўляецца тэзісна-аргументаваны характар канспекта, калі запісваюцца толькі асноўныя палажэнні і шэраг падмацоўваючых іх фактаў. Для паскарэння запісу неабходна шырока выкарыстоўваць скарачэнні слоў, умоўныя знакі, сімвалы. Канспектаванне лекцый – працэс індывідуальны, таму чужыя канспекты звычайна не забяспечваюць паспяховага авалодвання матэрыялам.

*Рэкамендацыі па афармленні канспекта:*

– падпішыце канспект (назва прадмета, асабістыя звесткі);

– канспект кожнай новай лекцыі пачынайце з новай старонкі: запішыце дату заняткаў, назву тэмы і план лекцыі;

– пакідайце на старонках сшытка вялікія палі, на якіх можна будзе запісаць свае заўвагі, дапаўненні, цытаты, кароткія вытрымкі з падручнікаў і кніг;

– рабіце запісы змястоўна, дакладна, разборліва, выдзяляючы раздзелы і падраздзелы, тэмы і падтэмы.

## Як працаваць на семінарскіх занятках

На семінарскіх занятках выступаюць студэнты, паказваючы свае веды па разглядаемай тэме. Выступленні могуць быць рознымі па форме: рэферат, даклад па асноўным пытанні, судаклад, дапаўненне, папраўка, абагульненне. Тэма семінара з’яўляецца агульнай для ўсёй

групы студэнтаў. Падчас семінара выяўляюцца незразумелыя і недастаткова засвоеныя пытанні, якія ўдакладняюцца. Выкладчык кіруе семінарам, пры неабходнасці дапаўняе адказы студэнтаў і выпраўляе памылкі, зробленыя імі.

Асновай для падрыхтоўкі студэнтаў да семінарскіх заняткаў у межсесійны перыяд з'яўляецца распрацаваны кафедрай план заняткаў, у якім даюцца назвы тэм семінараў з указаннем колькасці выдзеленых на іх разгляд гадзін, пералічваюцца вывучаемыя пытанні, асноўная і дадатковая літаратура.

***У падрыхтоўцы да заняткаў выдзяляюцца наступныя этапы.***

1. Падрыхтоўчы. Ён уключае азнаямленне з тэмай семінара, вывучэнне зместу плана, вызначэнне аб'ёму працы, выпрацоўку плана падрыхтоўкі.

2. Засваенне асноўнага вучэбнага матэрыялу. Выкарыстоўваюцца канспект лекцыі і падручнік, які служыць у якасці ўдакладняючай крыніцы ведаў.

3. Паглыбленне ведаў. Спачатку чытаецца найбольш важная спецыяльная літаратура па тэме, пасля – дадатковая, у тым ліку энцыклапедыі; пры неабходнасці праглядаецца Інтэрнэт. Пры гэтым робяцца выпіскі па кожным з разглядаемых пытанняў тэмы. Пажадана выпісваць таксама незразумелыя словы і выразы для таго, каб пазней удакладніць іх значэнне.

4. Заключны этап. Пасля назапашвання матэрыялу важна асэнсаваць яго, для чаго карысна прадумаць і скласці план выступлення па кожным з пытанняў разглядаемай тэмы.

*Да студэнтаў на семінарскіх занятках прад'яўляюцца наступныя патрабаванні:*

1) абавязкова прыходзіць на заняткі падрыхтаванымі;

2) звяртацца за кансультацыяй да выкладчыка, калі ў працэсе падрыхтоўкі ўзнікаюць складанасці;

3) быць актыўным, выказваць свае думкі, заўвагі, дапаўняць і ўдакладняць адказы таварышаў, задаваць ім пытанні;

4) пасля заняткаў з улікам выступленняў унесці неабходныя змены ў канспекты, спіс літаратуры.

Для больш змястоўнага авалодання матэрыялу пажадана падрыхтаваць да пачатку сесіі рэферат (міні-даследванне) аб аб'ектах гісторыка-культурнай спадчыны свайго рэгіёна, знакамітых асобах Беларусі (з выкарыстаннем мясцовага матэрыялу) або асаблівасцях гістарычнага развіцця сваёй мясцовасці.

## Тэма 1. ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА ЛІТОЎСКАЕ, РУСКАЕ, ЖАМОЙЦКАЕ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIII – ПЕРШАЯ ПАЛОВА XVI стст.)

1. Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Роля заходнерускіх зямель у працэсе дзяржаўнага будаўніцтва ВКЛ.

2. Органы дзяржаўнай улады Вялікага Княства Літоўскага, іх эвалюцыя і функцыі. Статуты ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг.

3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Вялікага Княства Літоўскага: сацыяльная структура, сельская гаспадарка і гарадское жыццё.

4. Асноўныя напрамкі знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага ў XIII–XVI стст.

5. Культура Беларусі (XIV–XVI стст.) і яе месца ў духоўным жыцці ўсходніх славян і агульнаеўрапейскім культурна-цывіліза-цыйным працэсе.

### 1. Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Роля заходнерускіх зямель у працэсе дзяржаўнага будаўніцтва ВКЛ.

Вялікае Княства Літоўскае ўвайшло ў сусветную гісторыю як адна з першых еўрапейскіх дзяржаў, што стварыла ўнікальны ўзор палітычнага і грамадскага ладу, мірнага суіснавання і супрацоўніцтва розных народаў і царкоўна-рэлігійных сістэм. Аснову гэтай дзяржавы склалі балта-літоўскія і ўсходнеславянскія землі і на працягу 500 год беларускія землі былі ў складзе ВКЛ (XIII–XVIII стст.).

Прычынамі ўтварэння ВКЛ сталі: развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці, рамяства, гандлю, рост гарадоў; паглыбленне сацыяльнай дыферынцыяцыі грамадства і супярэчнасцей паміж саслоўямі; неабходнасць барацьбы са знешняй небяспекай.

Працэс стварэння ВКЛ – адной з самых буйных дзяржаў Еўропы ў эпоху сярэднявечча – быў доўгім і складаным: пачаўся ён у першай палове XIII ст. і закончыўся ў 50–70-я гг. XIV ст. Ядром дзяржавы сталі землі Навагрудскага княства разам з суседнімі літоўскімі тэрыторыямі. Шляхі ўваходжання іншых беларускіх зямель у склад гэтага поліэтнічнага дзяржаўнага ўтварэння былі розныя: дыпламатычныя пагадненні (Полацкае княства); шлюбныя сувязі (Віцебскае княства); ваенныя захопы (Падолле, Падляшша, Валынь).

Цэнтралізатарскую палітыку па аб’яднанню беларускіх зямель вакол Навагрудка ажыццяўлялі: Міндоўг (сяр. 1240–1263-х гг.), які падпарадкаваў сабе князёў балцкіх плямён (аўкштайтаў і жэмайтаў),

паклаў пачатак утварэння ВКЛ; Трайдэн (1270–1272 гг.) далучыў землі ўсяго Верхняга Панямоння (яцвягаў, земгалаў, селаў), пасяліў у наваколлі Слоніма і Гродна заходніх балтаў (прусаў); Віцень (1295–1316 гг.), пры якім Полацкая і Берасцейкая землі сталі часткай ВКЛ; Гедымін (1316–1341 гг.), у час праўлення якога большая частка сучасных беларускіх зямель (ад Заходняга Буга да Дняпра) увайшла ў ВКЛ; Альгерд (1345–1377 гг.) захапіў Кіеўшчыну, Падолле, Валынь, Смаленскія, Чарнігава-Северскія і Бранскія землі.

ВКЛ у другой палове XIII – першай палове XVI стст.) існавала як феадальная, поліэтнічная, унітарная (цэнтралізаваная) дзяржава. Першай сталіцай княства быў Навагрудак, а з 1323 г. пры Гедыміне сталіца княства была перанесена ў Вільню. Пры Віцені ў 1384 г. быў уведзены герб «Пагоня».

### 2. Органы дзяржаўнай улады Вялікага Княства Літоўскага, іх эвалюцыя і функцыі. Статуты ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг.

У другой палове XIV – першай палове XV стст. ВКЛ было феадальнай манархіяй на чале з вялікім князем – носьбітам заканадаўчай, выканаўчай, судовай, ваеннай улады, якую ён ажыццяўляў у інтарэсах пануючага класа з дапамогай феадальнай знаці. Пры Гедыміне, Альгердзе, Вітаўце існавала неабмежаваная манархія, а Рада выступала дарадчым органам улады. З сярэдзіны і другой паловы XV ст. ВКЛ уяўляла сабой саслоўна-прадстаўнічую манархію, а органы ўлады фарміраваліся па “заходнееўрапейскаму ўзору”, дзе выразна вызначаліся тры галіны ўлады: заканадаўчая (Сейм і Рада); выканаўчая (князь і яго дружына, дзе галоўная роля належала канцлеру, гетману, біскупу, маршалку земскаму); судовая (першапачаткова вялікакняжацкі суд, а з 1581 г. – Галоўны Трыбунал ВКЛ).

Сейм (Сойм) – саслоўна-прадстаўнічы орган улады ВКЛ і Польшчы. Складаўся з прадстаўнікоў шляхты. На вальны (агульна-дзяржаўны) Сейм збіраліся: вялікі князь, службовыя асобы цэнтральнага і мясцовага кіравання, буйныя феадалы, якія ўваходзілі ў паны-раду, каталіцкія і праваслаўныя біскупы. З 1566 г. у склад Сейма выбіраліся таксама па 2 прадстаўнікі ад кожнага павета. Да кампетэнцыі вальнага сейма належылі: выбранне вялікага князя, справы вайны і міру, узаемаадносіны з іншымі краінамі, устанаўленне падаткаў і рэгуляванне заканадаўства. Сейм абмяжоўваў уладу вялікага князя і паноў-рады, паступова яго роля ў кіраванні ВКЛ узрастала. Акрамя вальнага збіраліся павятовыя і ваяводскія сеймікі.

Рада (паны-рада) – вышэйшы орган улады ў ВКЛ. У склад Рады ўваходзілі вышэйшыя службовыя асобы дзяржавы (канцлер, маршалак земскі, гетман найвышэйшы, ваяводы і інш.), а таксама прадстаўнікі каталіцкага духавенства і найбуйнейшыя феадалы. Да кампетэнцыі Рады належылі: выбранне вялікага князя, абарона дзяржавы, міжнародныя справы, выданне законаў, разгляд найважнейшых судовых спраў. Для вырашэння неадкладных пытанняў існавала тайная рада (віленскі біскуп, віленскія ваявода і кашталян, троцкія ваявода і кашталян).

Дзейнасць судовых устаноў ВКЛ абапіралася на трывалую заканадаўчую базу. Яна была прадстаўлена Статутамі ВКЛ, дзе былі сабраны нормы дзяржаўнага, зямельнага, грамадзянскага, сямейнага, крымінальнага і іншых галін права.

1529 г. – I Статут ВКЛ. Складзены з 283 артыкулаў, у якіх сістэматызаваны нормы мясцовага звычаёвага права, пастаноў судовых і дзяржаўных устаноў, Судзебніка 1468 г., прывілеяў. У Статуце юрыдычна замацаваны асновы грамадскага і дзяржаўнага ладу, прававое становішча класаў, саслоўяў і сацыяльных груп насельніцтва, абавязкі вялікага князя. Асаблівая ўвага ў Статуце аддавалася судова-працэсуальнаму праву. Абвяшчаўся прынцып публічнасці правасуддзя, роўнасці бакоў у працэсе, права абвінавачанага на абарону з удзелам адваката. Адначасова ў Статуце абазначалася захаванне прывілеяў і льгот для феадалаў; шмат увагі аддавалася шлюбна-сямейнаму праву.

1566 г. – II Статут ВКЛ. Складзены з 367 артыкулаў. Былі ўнесены змены ў нормы дзяржаўнага, судова-працэсуальнага права. Упершыню заяўлена аб аддзяленні суда ад органаў улады і кіравання, для гэтага ствараліся земскія і падкаморскія суды. Кіраўніком дзяржавы прызнаваўся вялікі князь, але многія яго паўнамоцтвы былі абмежаваны, і выконваць іх ён мог толькі са згоды Сейма.

1588 г. – III Статут ВКЛ. Меў 488 артыкулаў. У Статут увайшлі нормы дзяржаўнага (канстытуцыйнага) права, чаго на той час не было ў заканадаўчай практыцы іншых еўрапейскіх дзяржаў. У Статуце знайшла адлюстраванне тэорыя падзелу ўлад на заканадаўчую (Сейм), выканаўчую (вялікі князь, адміністрацыйны апарат) і судовую (Трыбунал ВКЛ, земскія і падкаморскія суды, выбарныя і незалежныя ад адміністрацыі). Статут юрыдычна замацоўваў тыя фактычныя адносіны, якія склаліся паміж ВКЛ і Польшчай пасля 1569 г., але абавязаў урад вярнуць адлучаныя ад княства землі, забараняў назначаць на дзяржаўныя пасады і надзяляць зямлёй падданых Польшчы, захаваў адасобленнасць дзяржаўных устаноў, арміі, заканадаўства, эканомікі і

фінансаў ВКЛ. Акрамя правоў і абавязкаў феадалаў і дзяржаўных асоб Статут рэгламентаваў правы і абавязкі простых людзей і прадстаўнікоў этнічных груп (яўрэяў, татараў). Упершыню ў Статуце была вызначана дзяржаўнасць беларускай мовы. Статут 1588 г. дзейнічаў на тэрыторыі Беларусі да 1840 г.

Такім чынам, працэс эвалюцыі ўлады ў ВКЛ адбываўся ў пераходзе ад неабмежаванай манархіі да саслоўна-прадстаўнічай, якая была замацавана ў 1492 г. у прывілеі вялікага князя Аляксандра. Роля паноў-рады і вальнага сейма ў дзяржаўным кіраванні становіцца вышэйшай за ролю вялікага князя.

### 3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Вялікага Княства Літоўскага: сацыяльная структура, сельская гаспадарка і гарадское жыццё.

Аснову эканамічнага развіцця ВКЛ у XIII–XVI стст. складала сельская гаспадарка. Галоўным сродкам вытворчасці з’яўлялася зямля, якая належала дзяржаве, свецкім феадалам і царкве. Феадальная ўласнасць на зямлю была саслоўнай і насіла іерархічны характар. Вярхоўным уласнікам зямлі, яе распарадчыкам быў вялікі князь. Зямельная маёмасць сярэдніх і дробных феадалаў знаходзілася ў залежнасці ад вялікага князя і насіла першапачаткова ўмоўны і абмежаваны характар. Князь рэгуляваў іх уладанні ў сваіх ваенна-палітычных і фінансавых мэтах. У сярэдзіне XVI ст. колькасць шляхты, якая валодала зямлёй у ВКЛ, складала каля 162 тыс. чалавек (9 % усяго насельніцтва). Апрацоўвалі зямлю сяляне, якія не мелі права ўласнасці на зямлю, а былі яе трымальнікамі. За карыстанне зямлёй сяляне (цяглыя, асадныя, агароднікі) выконвалі на карысць уласніка розныя павіннасці, якія знайшлі адлюстраванне ў дакументах запрыгоньвання сялян:

– Прывілей Казіміра 1447 г. забараняў феадалам прымаць беглых сялян і афармляў права поўнай уласнасці феадалаў на зямлю;

– Судзебнік Казіміра 1468 г. увёў пакаранне за дапамогу беглым сялянам і забараняў свабодна пераходзіць ім ад аднаго гаспадара да другога;

– Статут ВКЛ 1529 г. дазволіў зварот уцёклых сялян на працягу 10 гадоў і ўводзіў 10-гадовы тэрмін даўнасці, пры якім той селянін, які больш за 10 гадоў пражыў на зямлі шляхціча, станавіўся яго ўласнасцю;

– Аграрная рэформа 1557 г. (“валочная памера”) замацавала сялян за валокамі;

– Статут ВКЛ 1566 г. заканадаўча замацаваў 10-гадовы пошук уцёклых сялян і пацвердзіў 10-гадовы тэрмін даўнасці;

– Статут ВКЛ 1588 г. устанавіў 20-гадовы пошук уцёклых сялян і забараніў пераход "пахожых" сялян ад аднаго феадала да другога без адпрацовак і выплат, што азначала канчатковае юрыдычнае афармленне прыгоннага права.

Развіццё таварна-грашовых адносін выклікала неабходнасць удасканальвання феадальнай сістэмы гаспадарання, выкарыстання яе не толькі для простага самазабеспячэння вотчыны з яе натуральнай гаспадаркай, але і для вытворчасці прадукцыі на продаж. З XV ст. узнікаюць фальваркі – маёнткі з панскай ворыўнай зямлёй, гаспадарчымі і жылымі пабудовамі, рамеснымі майстэрнямі, агародамі, сенажацямі, лясамі, якія апрацоўвалі сяляне навакольных вёсак. З мэтай павелічэння даходаў дзяржавы шляхам змянення і ўдасканалення пазямельных адносін, пераходу ад сістэмы спагнання падаткаў з сям'і да сістэмы спагнання падаткаў з зямлі, у залежнасці ад яе колькасці і якасці была праведзена Жыгімонтам II Аўгустам аграрная рэформа – "валочная памера", асноўнымі накірункамі якой сталі: упарадкаванне землекарыстання, уніфікацыя феадальных павіннасцей, ліквідацыя цераспалосіцы, ліквідацыя падаткавых надзелаў.

Правядзенне рэформы прывяло да шырокага распаўсюджання новага віду феадальнага гаспадарання – фальваркова-паншчыннай сістэмы; запрыгоньвання сялян; разбурэння сялянскай абшчыны на захадзе і ў цэнтры Беларусі, пераходу сялян у гэтым рэгіёне да падворнага землекарыстання; укаранення трохполля і павышэння вытворчасці сельскагаспадарчай працы; канчатковага афармлення феадальнай саслоўнай карпаратыўнасці: саслоўя шляхты, сялян, мяшчан, духавенства са сваімі правамі і абавязкамі; развіцця гандлю і таварна-грашовых адносін.

У XIII–XVI стст. на беларускіх землях інтэнсіўна развіваліся гарады і мястэчкі, якія станавіліся цэнтрамі ажыўленага палітычнага і культурнага жыцця насельніцтва Беларусі. У сярэдзіне XVII ст. у гарадах і мястэчках пражывала 350–400 тыс. чалавек, або 12–13 %. Беларусы (ліцвіны) складалі 80 % гараджан. Этнічны склад гарадскога насельніцтва істотна дапаўняўся рускімі, яўрэямі, палякамі і інш. Разнастайным быў канфесійны склад гараджан: праваслаўныя, католікі, уніяты, іўдзеі, мусульмане, кальвіністы і інш., але пераважалі хрысціяне. Жыхары мястэчак і невялікіх гарадоў побач з рамяством і гандлем займаліся апрацоўкай зямлі і сельскагаспадарчымі промысламі.

З умацаваннем эканамічнай і грамадскай ролі гарадоў расло іх імкненне пашырыць свае правы і прывілеі. З канца XIV ст. дзяржаўная ўлада ВКЛ пайшла на дараванне гарадам самакіравання на аснове магдэбургскага права. У 1387 г. такое права было дадзена Вільні, у 1390 г. – Брэсту, у 1496 г. – Гродна, 1499 г. – Мінску і інш. Да сярэдіны XVII ст. магдэбургскае права атрымала большасць буйных гарадоў, каля паловы сярэдніх, у тым ліку і прыватнаўласніцкіх.

### 4. Асноўныя напрамкі знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага ў XIII–XVI стст.

Знешняя палітыка ВКЛ ажыццяўлялася па некалькім накірунках, галоўнымі з якіх былі паўночна-заходні, паўднёвы, усходні; асобае месца займалі адносіны з Польшчай.

На паўночна-заходнім накірунку галоўная пагроза для ВКЛ была звязана з Тэўтонскім і Лівонскім ордэнамі, якія ажыццяўлялі пастаянныя паходы на землі ВКЛ. Толькі ў 40–70 гг. XIV ст. на ВКЛ было арганізавана каля 100 паходаў. Літоўскія князі актыўна супрацiўляліся экспансіі: Віцень, Гедымін, Альгерд, Кейстут неаднаразова ажыццяўлялі паходы супраць крыжакоў. У 1409 г. пачалася "вялікая вайна" паміж ВКЛ і Польшчай, з аднаго боку, і Тэўтонскім ордэнам – з другога. Сакрушальны ўдар крыжакам быў нанесены ў бітве пад Грунвальдам (Польшча) 15 ліпеня 1410 г. У складзе войска Вялікага Княства Літоўскага, якое ўзначальваў Вітаўт, акрамя літоўскіх харугваў былі полацкая, віцебская, мсціслаўская, гарадзенская, берасцейская, пінская, навагародская, ваўкавыская, лідская і іншыя беларускія харугвы, а таксама рускія (смаленскія), украінскія, чэшскія войскі і татарская конніца. Аб'яднанымі войскамі ВКЛ і Польшчы кіраваў Ягайла. Перамога польска-літоўска-рускіх войск у гэтай бітве значна падарвала магутнасць ордэна і на працягу больш чым 500 гадоў нямецкія войскі не стваралі пагрозы для ўсходнеславянскіх зямель.

На паўднёвым накірунку асноўным супернікам ВКЛ выступала Залатая Арда, а пазней – Крымскае ханства. З другой паловы XIII ст. да першай паловы XIV ст. татары ажыццяўлялі перыядычныя набегі на землі ВКЛ. У 1363 г. Альгерд у выніку перамогі над татарамі ў бітве на рацэ Сінія Воды замацаваў за ВКЛ Падолле, Кіеўшчыну, Чарнігаўскія і Валынскія землі. У 1380 г. сумесная барацьба маскоўскага князя Дзмітрыя Данскога і сыноў Альгерда (Андрэя і Дзмітрыя) супраць Залатой Арды на Куліковым полі прывяла да перамогі над мангола-татарамі.

У другой палове XV ст. у знешняй палітыцы ВКЛ паўстала пытанне

ўзаемаадносін з паўднёвым суседам – Крымскім ханствам. Толькі за перыяд 1500–1569 гг. татары зрабілі 45 набегаў на беларускія землі. Сур'ёзнае паражэнне крымскім татарам было нанесена ў 1506 г. пад Клецкам, а ў 1527 г. пад Каневам (Украіна). З гэтага часу яны не маглі рушыць далёка на поўнач, а пазней татарскія ханствы выкарыстоўваліся Літоўскай дзяржавай як інструмент усходняй палітыкі.

На ўсходзе супернікамі ВКЛ за лідэрства ў славянскім свеце і збіранне зямель былой Русі былі княствы паўночна-ўсходняй Русі, а з сярэдзіны XIV ст. – Маскоўскае княства. Наступальную палітыку ва ўсходнім накірунку праводзіў Альгерд, які ажыццявіў тры паходы на Маскву (1368, 1370 і 1372 гг.), а князь Вітаўт у 1404 г. уключыў у склад ВКЛ Смаленскія землі.

З канца XV ст. абвастрыліся адносіны паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай. Гэта было звязана з завяршэннем палітычнай кансалідацыі Паўночна-Усходняй Русі, жаданнем і прэтэнзіямі вялікага князя маскоўскага аб'яднаць усе рускія землі і адыгрываць ролю адзінага праваслаўнага гасудара. Войны за "спрэчныя тэрыторыі" (смаленскія, віцебскія, чарнігаўскія і інш.) праходзілі ў 1492–1494 гг., 1500–1503 гг., 1507–1508 гг., 1512–1522 гг., 1534–1537 гг.

Складанымі і супярэчнымі былі адносіны ВКЛ з Польшчай. Іх аб'ядноўвала неабходнасць барацьбы з крыжакамі і імкненне польскай шляхты пры падтрымцы Ватыкана распаўсюдзіць каталіцтва на Літву. К саюзу з Польшчай імкнуўся князь Ягайла, падпісаўшы ў 1385 г. Крэўскую унію, па ўмовах якой кожная з краін зберагала сваю сістэму кіравання і праводзіла самастойную палітыку, але мела агульнага манарха. Крэўская унія дазволіла ВКЛ і Польшчы аб'яднаць сілы ў барацьбе са знешнімі ворагамі, але для беларускіх зямель гэта азначала пашырэнне ўплыву каталіцтва. Наступныя падзеі і міжнародныя абставіны прывялі ВКЛ да больш цеснага дзяржаўнага аб'яднання з Польшчай і падпісання Люблінскай уніі 1569 г., вынікам якой стала ўтварэнне новай дзяржавы – Рэчы Паспалітай.

**5. Культура Беларусі (XIV–XVI стст.) і яе месца ў духоўным жыцці ўсходніх славян і агульнаеўрапейскім культурна-цывілізацыйным працэсе.**

Уключэнне заходнерускіх зямель у склад ВКЛ супадае з працэсам далейшага фарміравання новай этнічнай супольнасці – беларускай народнасці. Яна, нараўне з рускай і ўкраінскай, утваралася на аснове старажытнарускай народнасці. Народнасць – гэта гістарычна сфарміраваная

супольнасць людзей (этнічная супольнасць), для якой характэрны адзіная мова, тэрыторыя, пэўныя эканамічныя сувязі, этнічная самасвядомасць, псіхічны склад і культура. Яна фарміравалася пад уздзеяннем культур суседніх народаў – рускага, польскага і літоўскага. Рабілі ўплыў і заходнееўрапейскія культурныя традыцыі гуманізму эпохі Адраджэння (Рэнесансу), асноўнымі рысамі якой з’явіліся: антрапацэнтрызм (у цэнтры ўвагі знаходзіцца чалавек); гуманізм (чалавекалюбства); цікавасць да антычнай спадчыны; свецкі характар культуры; мадыфікацыя (змяненне) хрысціянскай свядомасці (замест Бога і Веры прыходзяць разум і веды); фарміраванне нацыянальнай мовы і культуры (у Статуце ВКЛ 1588 г. старажытнабеларуская мова была вызначана дзяржаўнай мовай).

У вуснай народнай творчасці пашыраюцца казкі, песні, загадкі, прыказкі, у якіх адлюстроўваецца гераічнае мінулае народа – барацьба з крыжакамі і татарамі, любоў да Радзімы і незалежнасці, калектывізм і гасціннасць беларусаў. Узнікае беларускі лялечны тэатр – батлейка. Ідзе працэс станаўлення беларускай літаратуры і традыцый летапісання (“Летапісец вялікіх князёў літоўскіх”, “Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.”, “Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага”, “Хроніка Быхаўца”). З XV ст. на старабеларускую мову пачалі перакладацца творы пісьменства іншых народаў – “Александрыя”, “Аповесць пра Трою”, “Трыстан і Ізольда”.

У XVI ст. у беларускую літаратуру пранікаюць ідэі гуманізму і Рэфармацыі. Прадвеснікам гэтых ідэй з’яўляецца Францыск Скарына, усходнеславянскі і беларускі першадрукар, асветнік, навуковец, пісьменнік, публіцыст, мастак, грамадскі дзеяч эпохі Адраджэння. Да свайго роднага кутка, да свайго народа Ф. Скарына заўсёды ставіўся з вялікай пашанай, выказваў узнеслыя думкі: “Звери, ходящие в пустыни, знают ямы своя; птицы, летающие по воздуху, ведают гнезды своя; рыбы, плывущие по морю и в реках, чуют виры своя; пчелы и тым подобная боронять ульев своих. Тако ж и люди, игде зродилнся и ускормлены суть по Бозе, к тому месту великую ласку имають”. Як запавет нашчадкам даносяцца да нас з XVI ст. пранікнёныя і мудрыя словы Ф. Скарыны: “Любите книгу, ибо она – источник мудрости, знаний и науки, лекарство для души”.

У 1517 г. у Празе Ф. Скарына заснаваў сваю першую друкарню, дзе ў жніўні гэтага ж года выйшла ў свет яго кніга “Псалтыр”. На працягу 1517–1519 гг. Ф. Скарына пераклаў, пракаменціраваў і падрыхтаваў да друку 23 кнігі Бібліі, якую ў тыя часы лічылі своеасаблівым універсальным падручнікам, энцыклапедыяй, дзе чытач мог знайсці адказы на

складаныя пытанні жыцця. Да выдадзеных кніг Старога Запавету Ф. Скарынам было напісана 25 прадмоў і 24 пасляслоўі. Кнігі былі багата ілюстраваны гравюрамі, арнаментаваны вялікай колькасцю заставак, канцовак, загалоўных літар, тытульных лістоў, што зрабіла іх унікальнымі помнікамі кніжнай культуры. У Бібліі быў змешчаны таксама партрэт самога Ф. Скарыны, які з'яўляецца адзінай яго прыжыццёвай выявай.

Вярнуўшыся на радзіму, Ф. Скарына заснаваў у Вільні першую на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага друкарню, у якой каля 1522 г. выпусціў у свет “Малую падарожную кніжку”, а ў 1525 г. сваё апошняе выданне – “Апостал”. Кнігі Ф. Скарыны захоўваюцца зараз у бібліятэках і музеях свету (усяго захавалася каля 400 экзэмпляраў).

Славутым культурным дзеячам эпохі Адраджэння (Рэнесансу) быў Мікола Гусоўскі. Яго паэма “Песня пра зубра” створана ў Рыме і надрукавана ў Кракаве ў 1523 г. Амаль палову твора займаюць апісанні знешняга выгляду, павадак, ладу жыцця зубра, цара беларускіх пушчаў, і сцэны палявання на яго. Зубр для М. Гусоўскага быў сімвалам радзімы. Таму “Песня пра зубра” стала песняй пра Беларусь. Побач з вобразам зубра аўтар паэмы апявае прыгажосць беларускай прыроды, з захапленнем апавядае чытачам пра заняткі, звычаі і норавы беларускага народа. Паэт услаўляе свайго куміра, вялікага князя літоўскага Вітаўта, як ідэальнага гаспадара, называе час яго княжання залатым векам у гісторыі княства.

Сістэма адукацыі ВКЛ стваралася праз існаванне езуіцкіх школ у Полацку, Нясвіжы, Оршы, Гродна, Брэсце, Мінску, многія з якіх пазней (у Полацку, Гродна і Мінску) пераўтварыліся ў калегіумы. Праваслаўныя навучальныя ўстановы былі заснаваны пры брацтвах у Вільні, Брэсце, Пінску, Мінску, Слуцку, Магілёве і інш. У 1579 г. была створана Віленская акадэмія – найстаражытнейшая навучальная ўстанова на тэрыторыі Беларусі і Літвы, якая мела ўніверсітэцкі статус, а ў 1781 г. атрымала назву “Галоўная школа ВКЛ”, з 1803 г. – Віленскі ўніверсітэт.

Для архітэктуры XIV–XVI стст. характэрны абарончыя збудаванні, крэпасныя комплексы і культавыя пабудовы. Вядомы замкавыя комплексы ў Лідзе, Новагародку, Міры, Крэве, Смалянах і іншых гарадах і мястэчках Беларусі, якую ў гады сярэднявечча называлі краінай замкаў. На змену раманскаму стылю ў архітэктуры прыйшла готыка. Прыкладамі беларускай готыкі з'яўляюцца Мірскі замак, цэрквы-крэпасці: Сынковіцкая (в. Сынковічы, Зэльвенскі раён), Муравanкаўская, якая набыла яшчэ адну назву – Маламажэйкаўская (Шчучынскі

раён), Супрасльская (на тэрыторыі Падляшша), Барысаглебская царква ў Новагародку, Спаса-Праабражэнская царква ў Заслаўі.

Пасля Крэўскай уніі на тэрыторыі Беларусі сталі будавацца касцёлы. У XV–XVI стст. былі ўзведзены Троіцкі касцёл у в. Ішкалдзь (Баранавіцкі раён), касцёлы ў в. Уселюб (Навагрудскі раён) і ў Іўі, фарны касцёл у Навагрудку, Троіцкі касцёл у Клецку, касцёл Святога Духа ў Гродне, Мікалаеўскі касцел у в. Геранёны (Іўеўскі раён) і касцёл Святога Міхаіла ў в. Гнезна (Ваўкавыскі раён). Па прыкладу гэтых касцёлаў быў перабудаваны да XVIII ст. Полацкі Сафійскі сабор.

У жывапісе пераважаў іканапісны стыль. Найбольш характэрным яго творам з’яўляецца ікона Параскевы-Пятніцы (XIV–XV стст.). Да XV ст. адносіцца ўзнікненне свецкага жывапісу, прадстаўленага партрэтамі гістарычных асоб – магната Хадкевіча, князя Альгерда і г. д. Па манеры выканання гэтыя партрэты нагадваюць творы майстроў эпохі Адраджэння.

Такім чынам, у XIII–XVI стст. ва ўмовах феадальнага і культурна-нацыянальнага прыгнёту беларускі народ стварыў багатыя культурныя каштоўнасці. Яны з’явіліся значным укладам у агульнаеўрапейскі культурна-цывілізацыйны працэс.

## Важнейшыя падзеі

**1230–1240-я гг.–1370–1380 гг**. – утварэнне Вялікага Княства Літоўскага з цэнтрам у Навагрудку.

**1323 г.** – перанос сталіцы ВКЛ у Вільню.

**1362–1363 гг.** – бітва з мангола-татарамі на р. Сінія Воды, далучэнне да ВКЛ Кіеўскай, Чарнігава-Северскай, Падольскай і Валынскай зямлі.

**1384 г. –** герб “Пагоня” стаў гербам ВКЛ.

**1385 г., 14 жніўня** – падпісанне Крэўскай уніі паміж ВКЛ і Польшчай, згодна з якой Ягайла прыняў каталіцтва і абавязваўся аб’яднаць Польшчу з Літвою, ахрысціць язычнікаў Жамойціі і Аўкштайціі, даць правы на валоданне і поўнае распараджэнне зямлёй феадалам-католікам, узяўшы шлюб з польскай каралевай Ядзвігай.

**1392 г.** – падпісанне Востраўскага пагаднення паміж польскім каралём Ягайлам і Вітаўтам аб падзеле ўлады. З 1392 па 1430 г. вялікім князем літоўскім з’яўляўся Вітаўт. Паміж Польшчай і ВКЛ захавалася дынастычная унія і ваенны саюз супраць крыжакоў.

**1409–1411 гг**. – Вялікая вайна паміж ВКЛ і Польшчай, з аднаго боку, і Тэўтонскім ордэнам – з другога.

**1410 г., 15 ліпеня** – Грунвальдская бітва, вынікам якой з'явіўся разгром Тэўтонскага ордэна аб'яднанымі арміямі ВКЛ і Польскага каралеўства.

**1468 г., 29 лютага** – выдадзены Судзебнік Казіміра – першы збор законаў Вялікага Княства Літоўскага.

**1514 г., 8 верасня** – паражэнне маскоўскіх войскаў пад г. Орша. Беларуска-літоўскае войска ўзначальваў К. Астрожскі.

**1522 г.** – пачатак кнігадрукавання на тэрыторыі ВКЛ. Ф. Скарына выдаў у Вільні "Малую падарожную кніжку".

**1529, 1566, 1588 гг.** – выданне трох рэдакцый Статута ВКЛ – збору законаў феадальнага права, выдадзенага на беларускай мове.

**1540–1604 гг.** – жыццё і дзейнасць Васіля Цяпінскага (радавое прозвішча Амельяновіч) – радыкальнага дзеяча Рэфармацыі.

**1569 г., 1 ліпеня** – падпісанне Люблінскай уніі – пагаднення аб дзяржаўна-палітычным саюзе ВКЛ з Польшчай, паводле якога ўтварылася федэратыўная дзяржава – Рэч Паспалітая.

**1772, 1793, 1795 гг.** – падзелы Рэчы Паспалітай. Уключэнне тэрыторый Беларусі ў склад Расійскай імперыі.

**1791 г., 3 мая** – прыняцце Канстытуцыі Рэчы Паспалітай.

## Характэрныя тэрміны, паняцці

**Адраджэнне (Рэнесанс)** – эпоха росквіту мастацтва, станаўлення навук, узнікнення кнігадрукавання ў пераходны перыяд ад Сярэднявякоўя да Новага часу. Эпоха Адраджэння ў ВКЛ ахоплівае XVI – пачатак XVII стст.

**Батлейка** – лялечны тэатр.

**"Белая Русь"** – гістарычная вобласць Русі ў XII–XVII стст. У другой палове XVI–XVII стст. замацоўваецца за ўсходняй і цэнтральнай частакамі Беларусі. Заходнюю частку беларускай этнічнай тэрыторыі доўгі час называлі "Чорная Русь", пазней – "Літва". І толькі ў першай палове XX ст. тэрмін "Беларусь" распаўсюдзіўся на ўсю беларускую этнічную тэрыторыю.

**Брацтвы** – нацыянальна-рэлігійныя арганізацыі праваслаўнага насельніцтва, якія ўзніклі ў процівагу прапольска-каталіцкай палітыцы кіруючых колаў Рэчы Паспалітай. Буйныя беларускія брацтвы былі ў Вільні, Магілёве, Брэсце, Слуцку, Мінску, Пінску, Барысаве, Оршы, Полацку, Мсціславе і іншых гарадах.

**Ваяводствы** – адміністратыўна-тэрытарыяльныя адзінкі ў ВКЛ. З’явіліся ў 1413 г. пасля рэформы Вітаўта. Дзяліліся на паветы і воласці. Галоўнай асобай у ваяводстве быў ваявода, які ўзначальваў тут адміністрацыйныя, гаспадарчыя, ваенныя і судовыя органы. Назначаўся ваявода вялікім князем і Радаю пажыццёва з ліку багатых і знатных феадалаў, ураджэнцаў ВКЛ. Вая-вода ўваходзіў у склад Рады і быў абавязаны прысутнічаць на пасяджэннях сейма. Бліжэйшымі памочнікамі ваяводы былі: кашталян – па ваенных справах; падваявода – па адміністрацыйна-судовых; ключнік – наглядаў за зборам даніны і чыншаў; гараднічы – камендант замка, які клапаціўся аб яго рамонце і ўтрыманні.

**Віленская акадэмія** – найстаражытнейшая навучальная ўстанова на тэрыторыі Беларусі і Літвы, якая мела ўніверсітэцкі статус. Была заснавана ў 1579 г. У 1781 г. атрымала назву “Галоўная школа ВКЛ”, у 1796 г. – “Галоўная Віленская школа”, у 1803 г. – Віленскі ўніверсітэт. Першы рэктар – Пётр Скарга.

**Гетман найвышэйшы** – камандаваў узброенымі сіламі дзяржавы, калі на чале іх не стаяў сам вялікі князь. У час ваенных дзеянняў ён меў самыя шырокія паўнамоцтвы адносна ўсіх падначаленых асоб, у тым ліку права караць вінаватых. Яго наменікам быў гетман вольны, той, хто ўзначальваў войска ў паходзе.

**Гуманізм** – філасофскае вучэнне, якое сцвярджае высокую годнасць чалавека, прызнае яго права на зямное шчасце, свабоду чалавечай асобы, прапагандуе ідэалы чалавекалюбства.

**Жэмайція (Жмудзь, Жамойція)** – тэрыторыя цэнтральнай і заходняй часткі сучаснай Літвы, дзе адбываўся працэс утварэння літоўскага этнасу. Доўгі час Жэмайція была арэнай барацьбы з крыжакамі.

**Залатая Арда** – дзяржава, што існавала ў сярэдзіне XIII–XV стст., створана нашчадкамі мангольскага хана Чынгісхана са сталіцай у г. Сарай (Ніжняе Паволжжа). У перыяд найбольшай магутнасці ўключала ў свой склад Сярэднюю Азію, Паўночны Каўказ, палавецкія стэпы. Вяла войны з ВКЛ.

**Канцлер** – кіраваў дзяржаўнай канцылярыяй, наглядаў за падрыхтоўкай законапраектаў, прывілеяў, грамат і іншых дакументаў з дзяржаўнай канцылярыі. У яго знаходзілася вялікая дзяржаўная пячатка, без якой ніводзін закон не мог уступіць у сілу. Канцлер падпісваў найважнейшыя дзяржаўныя акты. Яму падпарадкоўваліся пісары, дзякі, талмачы. У канцылярыі пісьмова на беларускай мове (з 1696 г. – на польскай) афармляліся ўсе пастановы і распараджэнні князя і Рады.

Дакументы, што выходзілі з канцылярыі і прыходзілі туды, запісваліся ў асобныя кнігі, якія называліся Літоўскай Метрыкай.

**Контррэфармацыя** – выступленне каталіцкай рэакцыі супраць Рэфармацыі. На Беларусі ўзмацнілася пасля Люблінскай уніі 1569 г.

**Літва** – у XIII ст. гістарычная назва тэрыторыі Верхняга Панямоння. Балцкая тэрыторыя, але ў значнай ступені каланізаваная славянамі. Знаходзілася ў цэнтры фарміравання Вялікага Княства Літоўскага, да якога перайшла назва. Не блытаць з Літвой (дакладней – Летувай) этнічнай (у тыя часы – Жамойція).

**Магдэбургскае права** – права феадальнага горада на самакіраванне, паводле якога эканамічная дзейнасць, маёмасныя правы, грамадска-палітычнае жыццё, саслоўны стан гараджан рэгуляваліся ўласнай сістэмай юрыдычных нормаў. Па магдэбургскаму праву гараджане вызваляліся ад феадальных павіннасцей, ім гарантаваліся свабодныя заняткі рамяством, гандлем, земляробствам і дазвалялася выбіраць свой орган улады – магістрат, суд, ствараць рамесныя аб’яднанні – цэхі.

**Маршалак земскі** – старшынстваваў на пасяджэннях сойма і Рады, абвяшчаў пастановы гаспадара і Рады на гэтых пасяджэннях, быў даглядчыкам за парадкам і этыкетам пры двары і падчас афіцыйных цырымоній кіраваў прыёмам замежных паслоў, дапускаў да гаспадара просьбітаў са скаргамі і чалабітнымі, судзіў за злачынствы, зробленыя на сойме.

**Масква – Трэці Рым** – ідэялагічная формула, з дапамогай якой вялікія князі маскоўскія абгрунтоўвалі свае прэтэнзіі на землі ВКЛ, населеныя праваслаўнымі, якіх яны лічылі сваімі падданымі. Згодна з гэтай канцэпцыяй Масква з’яўляецца пераемніцай Рымскай імперыі і Візантыі (першага і другога Рыму) і адзінай праваслаўнай дзяржавай.

**Пагоня** – 1) усеагульны збор войска ў ВКЛ; 2) назва герба ВКЛ.

**Падскарбій земскі** – даглядчык дзяржаўнай казны, выконваў абавязкі міністра фінансаў, вёў улік дзяржаўных прыбыткаў і выдаткаў, наглядаў за спагнаннем натуральных і грашовых падаткаў і збораў.

**Пратэстантызм** – адзін з асноўных (побач з каталіцтвам і праваслаўем) напрамкаў у хрысціянстве. Аб’ядноўвае шэраг самастойных цэркваў і сект (лютэранства, кальвінізм, англіканская царква, баптысты, адвентысты і інш.), якія некалькі адрозніваюцца культам і арганізацыяй, але звязаны агульнасцю паходжання і дагматыкі. Асноўныя дагматычныя палажэнні пратэстантызму сфармуліраваны яго заснавальнікамі М. Лютэрам, Ж. Кальвіным, У. Цвінглі.

**Рада (паны-рада)** – вышэйшы орган улады ў ВКЛ. У склад рады ўваходзілі вышэйшыя службовыя асобы дзяржавы (канцлер, маршалак земскі, гетман найвышэйшы, ваяводы і інш.), а таксама прадстаўнікі каталіцкага духавенства і найбуйнейшыя феадалы. Узнікла як дапаможны орган пры вялікім князі, у канцы XV ст. набыла большую самастойнасць. Да кампетэнцыі Рады належылі: выбранне вялікага князя, абарона дзяржавы, міжнародныя справы, выданне законаў, разгляд найважнейшых судовых спраў. Для вырашэння неадкладных пытанняў існавала тайная рада (віленскі біскуп, віленскія ваявода і кашталян, троцкія ваявода і кашталян).

**Рэфармацыя** – шырокі грамадска-палітычны, ідэалагічны і рэлігійны рух, накіраваны на паслабленне каталіцкай царквы і асабістай улады пантыфіка. Узнікла ў XIV–XVI стст. у Еўропе. Аб'ектыўна мела антыфеадальны характар.

**Сейм (Сойм) –** саслоўна-прадстаўнічы орган улады ВКЛ і Польшчы. Складаўся з прадстаўнікоў шляхты. На вальны (агульна-дзяржаўны) сейм збіраліся: вялікі князь, службовыя асобы цэнтральнага і мясцовага кіравання, буйныя феадалы, якія ўваходзілі ў паны-раду, каталіцкія і праваслаўныя біскупы. З 1566 г. у склад сейма выбіраліся таксама па 2 прадстаўнікі ад кожнага павета. Да кампетэнцыі вальнага сейма належылі: выбранне вялікага князя, справы вайны і міру, узаемаадносіны з іншымі краінамі, устанаўленне падаткаў і рэгуляванне заканадаўства. Сейм абмяжоўваў уладу вялікага князя і паноў-рады, паступова яго роля ў кіраванні ВКЛ узрастала. Акрамя вальнага збіраліся павятовыя і ваяводскія сеймікі.

**Тэўтонскі ордэн** – ваенна-рэлігійная арганізацыя нямецкіх крыжакоў, была створана ў XII ст. у Палесціне. Ордэн быў запрошаны мазавецкім князем Кандратам у 1230 г. у Прыбалтыку для барацьбы з прусамі. Заваяваўшы прусаў, стварыў у Прыбалтыцы сваю дзяржаву. Вёў працяглыя войны з ВКЛ.

**Уніяцтва** – царкоўная плынь, заснаваная на царкоўнай уніі розных хрысціянскіх цэркваў з рымска-каталіцкай царквой на ўмовах прызнання вяршэнства папы рымскага і каталіцкай дагматыкі пры захаванні традыцый рэлігійнага культу і выкарыстання адпаведна традыцыйна сакральнай ці народнай мовы ў богаслужэнні.

**Чорная Русь** – гістарычная вобласць у басейне верхняга і сярэдняга Нёмана. На мяжы I і II тыс. н. э. заселена і каланізавана славянамі. На тэрыторыі Чорнай Русі ў XII ст. узнікла Гарадзенскае княства, пазней – Навагрудскае, Ваўкавыскае і г. д. Адыграла ролю цэнтральнай часткі, вакол якой ішло ўтварэнне Вялікага Княства

Літоўскага. Буйнейшы горад Чорнай Русі Навагрудак быў першай сталіцай ВКЛ.

## Гістарычныя асобы

**Альгерд** – вялікі князь ВКЛ. Кіраваў сумесна з братам Кейстутам. Павялічыў тэрыторыю дзяржавы ў 2,5 разы. Вёў войны з татарамі і Масквою.

**Астрожскі Канстанцін** – вялікі гетман ВКЛ, удзельнік войн ВКЛ з Масквою. Перамог войскі вялікага князя маскоўскага Васіля III пад Оршай ў 1514 г. З'яўляўся мецэнатам і падтрымліваў праваслаўную царкву ў ВКЛ.

**Браты Мамонічы (Кузьма і Лукаш)** – грамадскія дзеячы і беларускія друкары. Заснавалі друкарню ў Вільні, якая працавала з сярэдзіны 70-х гг. XVI ст. па 1623 г. Тут быў выдадзены Статут ВКЛ 1588 г. на старабеларускай мове, а ў 1614 г. – на польскай. Друкаваліся пастановы соймаў і іншыя заканадаўчыя акты

**Будны Сымон** – асветнік, гуманіст, рэлігійны рэфарматар, філосаф, кнігавыдавец. Паходзіў з сям'і дробнага шляхціца. Скончыў Кракаўскі ўніверсітэт і быў адным з самых адукаваных людзей свайго часу. У 1562 г. заснаваў у Нясвіжы друкарню, пры якой была, дарэчы, і па-перня. У Нясвіжскай друкарні С. Будны разам з М. Кавячынскім і Л. Крышкоўскім выдае кнігу "Катэхізіс". Потым Будны друкаваў тво-ры ў Брэсце, Лоску, Вільні. Там ён выказваў свае меркаванні па праб-лемах веры, аб "мірскім" прызначэнні чалавека, аб дзяржаўнай уладзе.

**Валовіч Я. Б.** – дзяржаўны і грамадскі дзеяч ВКЛ. Адзін з лідараў апазіцыі Люблінскай уніі 1569 г. Яго падтрымкай як мецэната карыс-таліся вядомыя гуманісты-рэфарматары С. Будны, В. Цяпінскі. Пад яго і Л. Сапегі кіраўніцтвам быў падрыхтаваны Статут ВКЛ 1588 г.

**Вітаўт** – вялікі князь ВКЛ. Праводзіў цэнтралізатарскую паліты-ку. У час кіравання Вітаўта ВКЛ дасягнула найбольшай магутнасці.

**Віцень** – вялікі князь ВКЛ. Веў барацьбу з крыжакамі. Праводзіў цэнтралізатарскую палітыку. Пачаў выкарыстоўваць "Пагоню" як дзяржаўны герб ВКЛ.

**Гедымін** – вялікі князь ВКЛ. У 1323 г. перанёс сталіцу ВКЛ у горад Вільню. Пачаў будаўніцтва каменных замкаў, абараняўшых землі ВКЛ ад крыжакоў. Пры Гедыміне ў склад ВКЛ увайшла большая частка зямель сучаснай Беларусі.

**Гусоўскі Мікола** – заснавальнік новалацінскай рэнесансавай паэзіі ВКЛ. У 1518 г. у складзе польска-літоўскай дыпламатычнай місіі тра-

піў у Рым, дзе стварыў свой лепшы твор – ліра-эпічную паэму “Песня пра зубра”, якая была выдадзена ў 1523 г. у Кракаве.

**Іван ІІІ** – вялікі князь маскоўскі. Аб’яднаў землі Паўночна-Усходняй Русі ў адзіную дзяржаву. Пачаў серыю войн з ВКЛ за гегемонію ва Усходняй Еўропе.

**Міндоўг** – першы вялікі князь ВКЛ, з’яўляўся адначасова і князем Навагрудка, які ён зрабіў сваёй сталіцай. У 1253 г. прыняў каталіцтва і каранаваўся каралеўскай каронай. Вёў барацьбу з галіцка-валынскімі князямі і крыжакамі. Быў забіты ў выніку змовы.

**Сапега Л. І. –** палітычны і грамадскі дзеяч ВКЛ, канцлер (1589–1623), гетман (1623–1633), адзін з арганізатараў Трыбунала ВКЛ 1581 г. і складальнікаў Статута ВКЛ 1588 г. Адстойваў суверэнітэт ВКЛ у складзе федэратыўнай Рэчы Паспалітай, выступаў супраць права польскай шляхты набываць у княстве маёнткі і пасады.

**Скарына Францыск** – нарадзіўся ў Полацку ў сям’і купца каля 1490 г. Першапачатковую адукацыю атрымаў у Полацку і, мабыць, у Вільні. У 1504–1506 гг. вучыўся на філасофскім факультэце Кракаўскага ўніверсітэта, дзе атрымаў званне бакалаўра, пазней – званне доктара філасофіі. У 1512 г. вытрымаў экзамен на ступень доктара медыцыны ў Падуі. 6 жніўня 1517 г. выдаў у Празе “Біблію” – першую друкаваную кнігу ўсходніх славян на царкоўнаславянскай мове ў беларускай рэдакцыі. Усяго было выпушчана 23 ілюстраваныя біблейскія кнігі. Прыкладна ў 1520 г. ён вярнуўся на радзіму і заснаваў у Вільні першую ўсходнеславянскую друкарню, дзе выдаў “Малую падарожную кніжку” (1522) і “Апостал” (1525). У канцы 20-х – пачатку 30-х гг. XVI ст. прывёз у Маскву вялікую партыю сваіх выданняў, але яны былі спалены, а Скарына быў высланы за межы Маскоўскай дзяржавы. Скончыў жыццё ў Празе каля 1551 г.

**Сматрыцкі Мялецій** – вядомы грамадска-палітычны і праваслаўны дзеяч, пісьменнік. Аўтар “Граматыкі”, публістычнага твора “Фрынас”, які быў напісаны ў форме плачу і з’яўляўся водгукам на пагром праваслаўных цэркваў і манастыроў у Вільні, учынены ў 1609 г. уніяцкім мітрапалітам Іпаціем Пацеем. Займаўся педагагічнай дзейнасцю ў праваслаўных брацкіх школах Вільні, Мінска, Кіева.

**Цяпінскі Васіль –** беларускі гуманіст, рэфармацыйны дзеяч, кнігавыдавец, пісьменнік. Прадаўжальнік гуманістычных і патрыятычных традыцый Ф. Скарыны і С. Буднага. У маёнтку Цяпіна заснаваў друкарню, дзе выдаў перакладзенае на беларускую мову “Евангелле” з уласнай прадмовай. Выкрываў разбэшчанасць святароў, выступаў за

маральную чысціню чалавека. Горача абараняў родную мову, гісторыю, традыцыі, быў прыхільнікам пашырэння адукацыі сярод простага люду.

**Ягайла** – вялікі князь ВКЛ, кароль Польшчы. У 1385 г. заключыў з Польшчай Крэўскую унію. Па выніках Востраўскага пагаднення 1392 г. вымушаны быў саступіць вялікакняжацкі стол Вітаўту. Галоўнакамандуючы аб'яднанай арміі Польшчы і ВКЛ пад час Вялікай вайны з Тэўтонскім ордэнам (1409–1411).

### Пытанні для самакантролю

1. Назавіце сацыяльна-эканамічныя і палітычныя прычыны фарміравання Вялікага Княства Літоўскага.
2. Які князь лічыцца пачынальнікам "збірання зямель ВКЛ"? Што вы ведаеце пра першую сталіцу дзяржавы?
3. Якія князі ўнеслі найбольшы ўклад у пашырэнне і ўмацаванне ВКЛ і калі гэта было?
4. Якая поўная назва Вялікага Княства Літоўскага?
5. Дзе і калі была прыпынена агрэсія Тэўтонскага ордэна на славянскія землі?
6. Ахарактарызуйце прыкладную структуру дзяржаўных органаў улады ў ВКЛ.
7. Якую ролю адыгрывалі статуты ВКЛ у прававой сістэме дзяржавы?
8. Якія накірункі знешняй палітыкі ВКЛ?
9. Як складваліся адносіны Вялікага Княства Літоўскага і Маскоўскай дзяржавы? Чым абгрунтоўвалі вялікія князі маскоўскія свае прэтэнзіі на землі ВКЛ?
10. Ахарактарызуйце дасягненні беларускай культуры ў эпоху Адраджэння.

## Тэма 2. САВЕЦКАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ СІСТЭМА Ў БЕЛАРУСІ (КАСТРЫЧНІК 1917 – ЧЭРВЕНЬ 1941 гг.)

1. Шляхі і метады будаўніцтва індустрыяльнага грамадства ў савецкай Беларусі (НЭП, індустрыялізацыя, калектывізацыя).
2. Станаўленне беларускай савецкай культуры. Палітыка беларусізацыі. Дасягненні і супярэчнасці развіцця культуры і навукі ў 30-я гг. XX ст.

3. Савецкая мадэль мадэрнізацыі грамадства. Усталяванне савецкай аднапартыйнай грамадска-палітычнай сістэмы ў БССР. Палітычныя рэпрэсіі 30-х гг. XX ст.

4. Геапалітычнае становішча Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст. Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы.

**1. Шляхі і метады будаўніцтва індустрыяльнага грамадства ў савецкай Беларусі (НЭП, індустрыялізацыя, калектывізацыя).**

На пачатку 1920-х гг. савецкая дзяржава апынулася ў крызісным стане. У знешнепалітычным плане крызіс праявіўся ў палітычнай ізаляцыі. Урады большасці краін адносіліся да Савецкай Расіі варожа. Перспектывы сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі аказаліся маларэальнымі. Ва ўнутрыпалітычным становішчы Савецкай дзяржавы крызіс праявіўся ў страце правячай партыяй даверу ў масах і ўзніккненні супярэчнасцяў паміж радавымі членамі і кіруючымі вярхамі, у сістэме кіравання, бюракратызацыі, адсутнасці дэмакратыі.

Вельмі цяжкім было сацыяльна-эканамічнае становішча ў Беларусі. Яно было выклікана сямігадовымі вынікамі першай сусветнай і грамадзянскай войнаў, германскай і польскай акупацыяй. У 1920 г. агульны аб'ём валавай прадукцыі прамысловасці склаў усяго 15–20 % даваеннага ўзроўню. Галоўнай прычынай і асаблівасцю сацыяльна-эканамічнага крызісу ў краіне з'яўлялася тое, што вытворца-селянін не мог больш мірыцца з харчразвёрсткай і палітыкай «ваеннага камунізму» – гвалтоўнымі метадамі кіравання эканомікай. Узнікла неабходнасць тэрміновага перагляду метадаў кіравання грамадствам і гаспадаркай. Вынікам пераадольвання крызісных з'яў у эканоміцы стала новая эканамічная палітыка – НЭП, пачатак якой быў пакладзены на X з'ездзе РКП(б) у сакавіку 1921 г. НЭП – гэта сістэма эканамічных, сацыяльных, палітычных і культурных мер пераходнага перыяду, накіраваных на развіццё вытворчых сіл і ўмацаванне саюза рабочага класа і сялянства, ажыццяўленне прынцыпа матэрыяльнай зацікаўленнасці.

НЭП прадугледжваў:

– у аграрнай сферы канчатковае пераразмеркаванне памешчыц-кай зямлі, пераход ад харчразвёрсткі да харчпадатку (1921). Сяляне маглі свабодна выбіраць формы арганізацыі апрацоўкі зямлі, выкарыстоўваць наёмную працу. Упершыню дзяржава гарантавала права селяніна распараджацца вынікамі сваёй працы;

– у прамысловасці быў адменены дэкрэт аб поўнай нацыяналізацыі, дазвалялася здача прадпрыемстваў у арэнду, атрымалі пад-

трымку дробныя ўласнікі і арандатары, назіраўся пераход буйных прадпрыемстваў да самаакупнасці, пераход да здзельнай аплаты працы, ствараліся трэсты і сіндыкаты, дапускаўся замежны капітал;

– у фінансава-банкаўскай сістэме аднаўляўся Дзяржбанк, ствараліся акцыянерныя і камерцыйныя банкі, адмяняліся абмежаванні на сумы ўкладаў і гарантавалася іх тайна, уводзіўся савецкі, забяспечаны золатам, чырвонец;

– у гандлёвай сферы існавала дзяржаўная манапалізацыя знеш-няга гандлю, дазваляўся прыватны і кааператыўны гандаль на ўнутраным рынку.

У Беларусі назіраліся свае асаблівасці правядзення НЭПа: больш хуткімі тэмпамі ішло аднаўленне сельскай гаспадаркі праз стварэнне хутарскіх гаспадарак, з’яўленне таварыстваў па сумеснай апрацоўцы зямлі і гандлёвых кааператываў; пераважаў рост дробнай прамысловасці, многія прадпрыемствы былі пераведзены на самазабеспячэнне і здадзены ў арэнду. Пачалі працаваць мінскія чыгуналіцейны і машынабудаўнічы заводы, крыштальны завод “Барысаў”, фабрыка запалак “Бярэзіна”, лесапільныя і гарбарныя заводы. У 1927 г. узровень развіцця дробнай прамысловасці перасягнуў даваенны; праводзілася электрыфікацыя Беларусі па асобным плане і да сярэдзіны 1920-х гг. было пабудавана больш за 20 электрастанцый, сярод якіх буйнейшая БелДРЭС у Аршанскім раёне.

Але к 1925 г. новая эканамічная палітыка была згорнута. Гэта было выклікана незадаволенасцю часткі партыйных і дзяржаўных кіраўнікоў, прыхільнікаў камандных метадаў кіраўніцтва і сацыялістычнага шляху развіцця грамадства; расслаеннем грамадства, у чым бальшавікі бачылі пагрозу сваім праграмным мэтам. Новая палітыка патрабавала правядзенне палітычных змен у кіраўніцтве дзяржавай, на якія ўрад не мог пайсці; неабходнасць пошуку вялікіх сродкаў на правядзенне індустрыялізацыі і паскоранага развіцця грамадства.

На пачатку 20-х гг. XX ст. Беларусь па-ранейшаму заставалася слабаразвітай у прамысловых адносінах рэспублікай. Аснову яе складалі харчовая, дрэваапрацоўчая, папяровая, гарбарная і іншыя галіны. Прамысловасць па-ранейшаму заставалася дробнай і кустарнай. Індустрыялізацыя прадугледжвала пераважнае развіццё цяжкай індустрыі і стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы сацыялізму, ператварэнне СССР у эканамічна-незалежную дзяржаву з магутным эканаміка-вытворчым, навукова-тэхнічным і абаронным патэнцыялам. Курс на яе правядзенне быў абвешчаны на XIV з’ездзе УКП(б) 18–31 снежня

1925 г. У СССР і БССР індустрыялізацыю планавалася ажыццявіць за 10–15 гадоў і пачынаць не з лёгкай, а з цяжкай прамысловасці, што патрабавала вялікіх капітальных укладанняў.

Крыніцамі сродкаў для правядзення індустрыялізацыі з'явіліся: прыбытак ад нацыяналізаваных фабрык і заводаў, усталяванне жорсткага рэжыму эканомікі, знешні гандаль збожжам і лесам, прымусовыя пазыкі, скарачэнне сродкаў на ўтрыманнне дзяржапарату, дзяржманаполія на гандаль гарэлкай, валютай і інш. Праходзіла індустрыялізацыя ў форме пяцігодак (першы 5-гадовы план быў распрацаваны на 1928–1932 гг.). У гэты час хуткімі тэмпамі развівалася цяжкая прамысловасць, ствараліся яе новыя галіны, будаваліся новыя і рэканструяваліся старыя прадпрыемствы, вялася падрыхтоўка кваліфікаваных рабочых кадраў і тэхнічнай інтэлігенцыі, развівалася сацыялістычнае спаборніцтва.

У БССР індустрыялізацыя праводзілася ў сціслыя тэрміны і мела свае асаблівасці: пераважна развівалася прамысловасць групы "Б" (вытворчасць прадметаў спажывання), назіралася арыентацыя на перапрацоўку мясцовай сыравіны, фінансаванне ажыццяўлялася з мясцовага і агульнасаюзнага бюджэтаў, выкарыстоўваліся магчымасці саматужна-рамесніцкай вытворчасці.

За гады першых пяцігодак (1928–1932 гг., 1933–1937 гг.) пачалі дзейнічаць фабрыка штучнага валакна ў Магілёве, фабрыка "КІМ" у Віцебску, завод сельскагаспадарчых машын у Гомелі, цэментны завод у Крычаве, радыёзавод у Мінску, кандытарскія фабрыкі "Камунарка" і "Спартак" і інш.

Велізарнае значэнне ў жыцці нашага грамадства, 4/5 насельніцтва якога ў 20–30-я гг. складала сялянства, мелі радыкальныя пераўтварэнні сельскай гаспадаркі. Калектывізацыя – аб'яднанне аднаасобных сялянскіх гаспадарак у калектыўныя. Стварэнне калгасаў у розных формах пачалося ўжо пасля рэвалюцыі. У 20-я гг. пачалі развівацца розныя формы кааперацыі. У 1921 г. уся зямля была перададзена бясплатна сялянам у карыстанне. Свабода выбару форм землекарыс-тання захоўвалася аж да 1927 г. Да гэтага часу ў Беларусі развіваліся сельгасарцелі, камуны, таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі; разнастайныя прасцейшыя формы кааперацыі (крэдытная, забеспячэнская, збытавая) і аднаасобнага землекарыстання (двары, хутары і адрубы). У канцы 20-х гг. хутарская сістэма на Беларусі складала больш за 25 % сялянскага землекарыстання.

Калгасы разглядаліся ў асноўным як форма арганізацыі бяднейшых пластоў насельніцтва і ствараліся яны, як правіла, на землях

дзяржаўнага фонду. На XV з'ездзе УКП(б) 2–19 снежня 1927 г. быў узяты курс на калектывізацыю, а з 1929 г. у БССР пачаўся пераход да масавай, суцэльнай калектывізацыі, якая праводзілася ў асноўным прымусовы-мі метадамі. Крыніцамі для ажыццяўлення калектывізацыі з'явіліся: аб'яднанне маёмасці сялян, раскулачванне заможных сялян, закупка сельскагаспадарчай сыравіны і прадукцыі па нізкіх цэнах. К 1927 г. у БССР налічвалася звыш 400 арцелей, камун і таварыстваў па сумеснай апрацоўцы зямлі. Прадугледжвалася, што развіццё калектывізацыі будзе адбывацца на добраахвотнай аснове і спалучацца з іншымі відамі кааперацыі. Але для правядзення індустрыялізацыі патраба-валіся вялікія сродкі, якія вырашылі ўзяць з вёскі, і таму 5 студзеня 1930 г. ЦК УКП(б) зацвердзіў пастанову "Аб тэмпе калектывізацыі і мерах дапамогі дзяржавы калгаснаму будаўніцтву", а 30 студзеня – пастанову "Аб мерапрыемствах па ліквідацыі кулацкіх гаспадарак у раёнах суцэльнай калектывізацыі". Гэтыя дакументы прадугледжвалі паскора-ныя тэмпы правядзення калектывізацыі і пывялі да памылак і злоўжыванняў у яе развіцці.

У Беларусі калектывізацыя суправаджалася масавым і паскораным высяленнем хутарскіх гаспадарак у калгасныя цэнтры, што ў 1938–1939 гг. прывяло да ліквідацыі хутароў. Па афіцыйным дадзеным калектывізацыя ў БССР завяршылася ў 1935 г., калі ў калгасы было аб'яднана 86 % гаспадарак і звыш 90 % пасяўных плошчаў. У выніку правядзення калектывізацыі дзяржава атрымала поўны кантроль над сельскай гаспадаркай. Былі забяспечаны ўмовы для правядзення індустрыялізацыі. Да 1958 г. у калгаснікаў не было пашпартоў.

Вынікам будаўніцтва сацыялізму ў СССР і БССР з'явілася не толькі ажыццяўленне індустрыялізацыі і калектывізацыі, але і фарміраванне "адміністрацыйнага сацыялізму", асноўнымі рысамі якога сталі: манапольная дзяржаўная ўласнасць на сродкі вытворчасці; дырэктыўнае планаванне; цэнтралізаванае размеркаванне ўсіх відаў прадукцыі і рэсурсаў; прымяненне пазаэканамічных метадаў, форм прымушэння; ураўняльныя тэндэнцыі пры размеркаванні вынікаў працы; экстэнсіўны тып эканамічнага жыцця; шматлікі бюракратычны апарат.

## 2. Станаўленне беларускай савецкай культуры. Палітыка беларусізацыі. Дасягненні і супярэчнасці развіцця культуры і навукі ў 30-я гг. XX ст.

Эканамічныя і грамадска-палітычныя працэсы пачатку 20-х гг. садзейнічалі актывізацыі нацыянальна-культурнага жыцця ў рэспубліцы. У ліпені 1924 г. па ініцыятыве ЦК КП(б)Б у БССР была абвешчана

беларусізацыя – нацыянальна-дзяржаўная і нацыянальна-культурная палітыка, накіраваная на развіццё нацыянальнай культуры, мовы, фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці і вылучэнне беларусаў на кіруючыя пасады у савецкія, партыйныя, дзяржаўныя органах. Прадугледжваўся комплекс мерапрыемстваў па адраджэнню беларускай культуры, школы, мовы з мэтай забеспячэння ўсебаковага вывучэння гісторыі, этнаграфіі, эканомікі Беларусі, развіцця беларускага кнігадрукавання і стварэння сістэмы адукацыі, арганізацыі навукова-даследчай работы. Асноўнымі мерапрыемствамі беларусізацыі сталі:

– адміністрацыйна-тэрытарыяльныя рэформы (у 1924 і 1926 гг. адбылося ўзбуйненне тэрыторыі БССР);

– абвяшчэнне чатырохмоўя (дзяржаўнымі станавіліся беларуская, руская, яўрэйская і польская мовы);

– перавод дзяржаўнага апарату на беларускую мову (у 1927 г. каля 80 % служачых у цэнтральных органах улады валодалі беларускай мовай);

– вылучэнне на кіруючыя пасады прадстаўнікоў мясцовага насельніцтва (каранізацыя);

– перавод навучання ў школах на беларускую мову (да 1928 г. каля 80 % школ было беларускамоўнымі);

– стварэнне сістэмы вышэйшай адукацыі (аднавіў працу земляробчы інстытут у Горках, былі адкрыты ветэрынарны інстытут у Віцебску, педагагічныя інстытуты ў Мінску, Віцебску, Магілёве, Гомелі і інш);

– арганізацыя навукова-даследчай дзейнасці (у 1929 г. Інстытут беларускай культуры рэарганізаваны ў Беларускую Акадэмію Навук);

– выданне кніг, перыядычных выданняў, навучальных дапаможнікаў на беларускай мове (утворана выдавецтва "Савецкая Беларусь", пачалося выданне газеты "Савецкая Беларусь", часопіса "Наш край"), адкрыццё Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі;

– падтрымка развіцця беларускай літаратуры, утварэнне літаратурных аб'яднанняў: "Маладняк" – у 1923 г. (М. Лынькоў, М. Чарот, П. Трус, П. Галавач і інш.), "Узвышша" – у 1926 г. (А. Бабарэка, П. Глебка, З. Бядуля, М. Лужанін, К. Крапіва і інш.) і "Полымя" – у 1927 г. (Я. Колас, Я. Купала, Ц. Гартны, М. Чарот і інш.). У 1928 г. узнікла Беларуская асацыяцыя пралетарскіх пісьменнікаў (БелАПП);

– падтрымка развіцця нацыянальнага тэатральнага мастацтва і кіно. З поспехам працавалі Беларускі драматычны тэатр (БДТ), які ў 1921 г. узначаліў Я. Міровіч, і трупа У. Галубка. У 1926 г. у Віцебску

адчыніўся БДТ-2. У Гомелі і Магілёве з'явіліся сімфанічныя аркестры. У 1926 г. у Ленінградзе на студыі "Савецкая Беларусь" быў зняты першы беларускі фільм "Лясная быль" Ю. Тарыча.

У 20-я гг. разам з палітыкай беларусізацыі праводзілася барацьба з непісьменнасцю. У 1926 г. было створана таварыства "Прэч непісьменнасць", якое ўзначаліў старшыня ЦВК БССР А. Чарвякоў. Была прынята пастанова "Аб увядзенні ўсеагульнага пачатковага навучання". К 1939 г., па афіцыйным дадзеным, была ліквідавана ў цэлым непісменнасць насельніцтва Беларускай ССР.

## 3. Савецкая мадэль мадэрнізацыі грамадства. Усталяванне савецкай аднапартыйнай грамадска-палітычнай сістэмы ў БССР. Палітычныя рэпрэсіі 30-х гг. ХХ ст.

Сацыяльна-эканамічнае і грамадска-палітычнае развіццё СССР прыняло пад канец 20-х гадоў і асабліва ў пачатку 30-х гадоў выразна акрэсленыя камандна-адміністрацыйныя рысы, якія ў рэшце рэшт прывялі да ўсталявання таталітарнага рэжыму. Гэта быў даволі супярэчны час, калі спалучаліся працоўны энтузіязм народа і яго страх перад уладай і беззаконнем, узмоцненым рэпрэсіямі.

Асноўнымі прыкметамі грамадска-палітычнага жыцця ў 30-я гг. ХХ ст. сталі: існаванне аднапартыйнай палітычнай сістэмы, кантроль з боку КП(б)Б над грамадскім жыццём (манаполія КП(б)Б была замацавана ў Канстытуцыі 1927 г.), культ асобы Сталіна, панаванне сталінскай тэорыі аб узмацненні класавай барацьбы па меры руху грамадства да сацыялізму, ажыццяўленне палітычных рэпрэсій; безальтэрнатыўны парадак выбараў дэпутатаў у Саветы па спісах, узгодненых з партыйным кіраўніцтвам. Саветы, прафсаюзы, грамадскія арганізацыі былі прыдаткам партыйнай сістэмы, якая стала вынікам мілітарызацыі партыі і зрошчвання яе з дзяржаўным апаратам, адсутнасцю дэмакратычных традыцый, нізкім узроўнем адукаванасці і культуры насельніцтва, асабістымі рысамі Сталіна.

Усталяванне ў Савецкім Саюзе культу асобы Сталіна прывяло да масавых чыстак партыйных арганізацый ад "ворагаў народа" і палітычных рэпрэсій. Пад палітычнымі рэпрэсіямі маецца на ўвазе неабгрунтаванае прыцягненне да крымінальнай адказнасці за дзяржаўныя злачынствы, а таксама ссылка, высылка, накіраванне на спецпасяленне, высяленне за межы Беларусі. Кіраўнікі рэспублікі – М. Гікала, М. Галадзед, А. Чарвякоў, Дз. Прышчэпаў, Дз. Жылуновіч – сталі ахвярамі палітычных рэпрэсій. Былі рэпрэсіраваны 99 са 101 першых

сакратароў райкомаў КП(б)Б. Толькі па справе 1930 г. аб неіснуючым "Саюзе вызвалення Беларусі" было арыштавана 108 чалавек, у тым ліку В. Ластоўскі, Д. Прышчэпаў, А. Смоліч, М. Гарэцкі і інш. Ахвярамі сталінізму сталі многія палітычныя і культурныя дзеячы, вучоныя, артысты, пісьменнікі, святары і нават простыя людзі. Толькі з пачатку 1950-х гг. да 1994 г. у Беларусі было рэабілітавана больш за 160 тыс. грамадзян, якія беспадстаўна пацярпелі ад палітычных рэпрэсій у 20–50-я гг. XX ст.

Пераход да таталітарызму праяўляўся ў далейшым паніжэнні ролі і ўдзелу ў справах грамадства дэмакратычных, прадстаўнічых органаў, поўным іх падпарадкаванні партыйнаму апарату. Саветы ў 30-я гг. ужо толькі стваралі бачнасць улады працоўных. Іх фарміраванне і дзейнасць адбываліся на падставе дырэктыўных указанняў, якія выключалі крытыку партыйна-дзяржаўных органаў, спаборнасць кандыдатур, плюралізм думак. Гэта датычылася дзейнасці не толькі Саветаў, але і прафсаюзаў, камсамола, якія канчаткова страцілі нават мізэрныя рэшткі самастойнасці. Усяго ў 20–50-х гг. у Беларусі было неабгрунтавана рэпрэсіравана ў адміністрацыйным парадку звыш 349 тыс. чалавек, а агульная колькасць ахвяр палітычных рэпрэсій склала каля 600 тыс. чалавек. За самавольства Сталіна і яго акружэння наш народ заплаціў вялікую цану.

**4. Геапалітычнае становішча Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст. Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы.**

У выніку падпісання Рыжскага мірнага дагавора паміж Польшчай і Савецкай Расіяй (18 сакавіка 1921 г.) заходнія беларускія тэрыторыі плошчай 98815 км$^2$ з насельніцтвам звыш 3 млн. чалавек (з іх беларусаў больш за 50 %) сталі часткай "другой Рэчы Паспалітай". Яны былі падзелены на чатыры ваяводствы (Віленскае, Беластоцкае, Палескае і Навагрудскае), 29 паветаў і гміны. Палякі называлі гэтыя тэрыторыі "крэсы ўсходнія", "паўночна-ўсходнія землі Польшчы", "Белапольшча", што падкрэслівала пазіцыю непрызнання беларускіх зямель як асобнай не толькі тэрытарыяльна-палітычнай, але і этнічнай адзінкі.

У эканамічным плане Заходняя Беларусь была аграрным рэгіёнам, так як у сельскай гаспадарцы гэтага краю было занята звыш 80 % насельніцтва. Многія сяляне пакутавалі ад мала- ці беззямелля. Звыш 50 % пашы належала памешчыкам. У 20-х гг. польскі ўрад праводзіць на далучаных землях шэраг аграрных рэформ: парцэляцыю – продаж памешчыкамі праз банк часткі сваіх зямель па фіксаваных цэнах;

камасацыю – аб'яднанне ў адзіны надзел дробных сялянскіх палосак і высяленне сямей на хутары; пераход сервітутаў – сумесных для карыстання памешчыкаў і сялян зямель (сенажаць, лес, месца для рыбнай лоўлі і інш.) – да прыватных уласнікаў. У выніку комплексных мерапрыемстваў у сельскай гаспадарцы ўмацавалася становішча заможных і сярэдніх сялян, паскорыўся працэс сацыяльнага расслаення на вёсцы, актывізавалася канцэнтрацыя сельгасвытворчасці. У 1926 г. быў прыняты закон, па якім польскія афіцэры і унтэрафіцэры (асаднікі) маглі набываць на далучаных да Польшчы землях за невялікія грошы надзелы плошчай ад 15 да 45 гектараў. Яны мелі права насіць зброю і карыстацца ёй па сваім жаданні. Гэтай мерай польскі ўрад імкнуўся стварыць сабе сацыяльную апору на вёсцы.

Прамысловасць Заходняй Беларусі насіла пераважна дробны характар (каля 80 % прадпрыемстваў) з найбольшым развіццём харчовай і дрэваапрацоўчай галін. У адносінах да рабочых прымянялася пашыраная сістэма штрафаў, не развівалася сацыяльнае заканадаўства, рабочы дзень дасягаў 12–14 гадзін. Сярэдняя заработная плата рабочага на заходнебеларускіх прадпрыемствах складала каля 68 % ад заработнай платы рабочага ў Цэнтральнай Польшчы. Значна абвастрыў стан працоўных эканамічны крызіс 1929–1933 гг., у выніку якога 46 % рабочых засталіся без працы. Адным з вынікаў непамернай эксплуатацыі народа і цяжкага сацыяльна-эканамічнага стану стаў масавы выезд за мяжу: за 1921–1939 гг. краіну пакінулі каля 120–150 тыс. чалавек, выхадцы з Беларусі пераязджалі ў Канаду, ЗША, краіны Заходняй Еўропы і Лацінскай Амерыкі.

Яшчэ адным паказчыкам цяжкага становішча стала нацыянальна-рэлігійная палітыка польскага ўрада, якая мела мэтай непрызнанне і далейшае знішчэнне беларускай нацыі. Зачыняліся навучальныя ўстановы з беларускай мовай навучання, мясцовыя настаўнікі замяняліся польскімі, скарачалася колькасць беларускіх бібліятэк, клубаў, хат-чытальняў, выдавецтваў, а значыцца і выданняў (з 23 беларускіх газет і часопісаў у 1927 г. праз пяць год засталося толькі 8). Беларускую мову забаранялася ўжываць у дзяржаўных установах. Няведанне польскай мовы прызнавалася непісьменнасцю і вяло да пазбаўлення выбарчых правоў. Зачыняліся ці ператвараліся ў каталіцкія праваслаўныя храмы.

На тэрыторыі Заходняй Беларусі дзейнічала 19 турмаў і канцэнтрацыйны лагер у Бярозе-Картузскай. Рэжым санацыі Ю. Пілсудскага (1926–1939 гг.) узмацніў сацыяльны, нацыянальны і рэлігійны прыгнёт, што выклікала актывізацыю нацыянальна-вызваленчага і рэвалю-

цыйнага руху ў Заходняй Беларусі. У першай палове 20-х гг. пераважалі ўзброеныя выступленні партызанскага характару. У паўночна-заходнім рэгіёне дзейнічалі беларускія эсэры, яны вылучалі патрабаванні самавызначэння беларускіх зямель і спынення ўрадавых рэпрэсій. З 1923 г. у заходнебеларускім рэгіёне пачынае дзейнічаць Камуністычная партыя (КПЗБ), якая разам з заходнеўкраінскай, з'яўлялася часткай кампартыі Польшчы (КПП). У 1924 г. з'явіўся Камуністычны Саюз Моладзі Заходняй Беларусі (першы сакратар – В. Харужая). З'яўленне новай палітычнай сілы – КПЗБ – спрыяла пашырэнню партызанскага руху. Але актывізацыя ўзброеных выступленняў паўплывала на ўвядзенне асаднага становішча і далейшае згортванне партызанскай барацьбы.

У сярэдзіне 20-х гг. на палітычную сцэну выходзіць яшчэ некалькі сіл, сярод якіх вызначаецца Беларуская сялянска-работніцкая грамада (БСРГ). За два гады існавання (1925–1927) яна ператварылася ў самую масавую палітычную арганізацыю сялян Еўропы. Яе праграмныя мэты: самавызначэнне Заходняй Беларусі, аб'яднанне ўсіх беларускіх зямель, сялянска-рабочы ўрад, ліквідацыя асадніцтва, дэмакратыя, свабода, нацыянальная роўнасць і навучанне на роднай мове. На пазіцыях нацыянальнага вызвалення беларускага народа стаялі некаторыя іншыя партыі і арганізацыі. Яшчэ ў 1922 г. у польскім сейме пачала сваю працу фракцыя "Беларускі пасольскі клуб", якую стварылі 11 лідараў розных палітычных сіл Заходняй Беларусі. Яе галоўнай мэтай было адстойванне інтарэсаў беларускага насельніцтва праз парламенцкую дзейнасць.

У першай палове 30-х гг. значна зніжаецца колькасць выступленняў з нацыянальна-вызваленчымі лозунгамі. Прычына таму – эканамічны крызіс, які пацягнуў за сабой значнае пагаршэнне стану жыцця працоўных. У рабочым руху адзначаецца паступовы рост забастовачнай барацьбы з перавагай стачак эканамічнага характару. З 1931 г. пачынаецца рост сялянскіх выступленняў; адбываецца ўзброенае паўстанне сялян Кобрынскага павета (1933) і найбуйнейшае паўстанне нарачанскіх рыбакоў, у якім удзельнічала каля 5 тыс. чалавек (1935–1939). Другая палова 30-х гг. стала цяжкім часам для рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. У Еўропе шырылася фашысцкая пагроза. У 1935 г. быў створаны адзіны антыфашысцкі фронт. Гэта садзейнічала рэвалюцыйнаму ўздыму 1936–1937 гг., які змяніўся спадам. Жорсткая рэпрэсіўная палітыка польскіх улад прыводзіла да шматлікіх арыштаў лідараў палітычных арганізацый (арыштавана

больш за 30 тыс. чалавек) і забароны іх дзейнасці. У 1938 г. Камінтэрнам была распушчана КПП і яе адгалінаванне – КПЗБ.

Зместам нацыянальна-культурнай палітыкі польскіх улад на заходнебеларускіх землях была прымусовая паланізацыя і асіміляцыя мясцовага насельніцтва. Супраць гэтага выступіла Таварыства беларускай школы. Яно дзейнічала на працягу 1921–1937 гг. У розны час яго ўзначальвалі Б. Тарашкевіч, І. Дварчанін, Р. Шырма і інш. Яго сябры выступалі за беларускую школу, рыхтавалі новыя падручнікі, стваралі чытальні, гурткі самаадукацыі. У канцы 20-х гг. пад націскам грамадскасці было адчынена 18 беларускіх школ. Ідэйным кіраўніком ТБШ стаў вучоны-філолаг, літаратар, аўтар "Беларускай граматыкі для школ" (1918) Браніслаў Тарашкевіч.

Сапраўднымі асяродкамі беларускай мовы і культуры становяцца Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры (1926–1936), беларускія гімназіі ў Вільні (1914–1944), Навагрудку, Нясвіжы, Радашковічах, Клецку, Будславе (зачынены ў канцы 20-х – пачатку 30-х гг.). У 1921 г. на базе прыватнай калекцыі беларускага археолага і этнографа І. Луцкевіча па ініцыятыве Беларускага навуковага таварыства (1918–1939) быў заснаваны Віленскі беларускі гісторыка-этнаграфічны музей. Такое становішча назіралася увесь час знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе буржуазнай Польшчы (з 1921 па 1939 г.).

## Важнейшыя падзеі

**1921 г., 18 сакавіка** – падпісанне Рыжскага мірнага дагавора паміж РСФСР і Украінай, з аданаго боку, і Польшчай – з другога. Да Польшчы адышла значная частка тэрыторыі Беларусі. Граніца з Польшчай прайшла за 30 км на захад ад Мінска. За ССРБ захавалася толькі шэсць паветаў Мінскай губерні.

**1921 г., сакавік** – дэкрэт УЦВК "Аб замене харчовай развёрсткі натуральным падаткам". Пачатак НЭПа.

**1922 г., люты** – адкрыццё ў Мінску Інстытута беларускай культуры (Інбелкульта), у 1929 г. рэарганізаваны ў Беларускую Акадэмію Навук.

**1924 г., сакавік** – дэкрэт УЦВК аб перадачы БССР паветаў Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў з пераважна беларускім насельніцтвам.

**1924 г., ліпень** – афіцыйны пачатак правядзення беларусізацыі ў БССР.

**1925 г., жнівень** – пастанова ЦВК і СНК БССР аб утварэнні Беларускай дзяржаўнай акадэміі сельскай гаспадаркі.

**1926 г., снежань** – пастанова Прэзідыума УЦВК аб передачы Рэчыцкага і Гомельскага паветаў у склад БССР.

**1927 г., красавік** – VIII з’езд Саветаў БССР. Прыняцце другой Канстытуцыі БССР. У ёй былі замацаваны змены ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле рэспублікі ў выніку ўзбуйнення яе тэрыторыі, зацверджаны Дзяржаўны герб і сцяг Беларускай ССР.

**1928–1932 гг.** – першая пяцігодка ў СССР.

**1929 г., люты** – XII з’езд КП(б)Б выказаўся за падрыхтоўку да новай масавай калектывізацыі вёскі.

**1929–1930 гг.** – хваля рэпрэсій у БССР супраць прадстаўнікоў так званага «нацыянал-дэмакратызму».

**1932 г., снежань** – пастанова ЦВК і СНК БССР “Аб аб’яўленні БССР краінай суцэльнай калектывізацыі”.

**1933–1937 гг.** – другая пяцігодка ў СССР.

**1937 г., люты** – XII (надзвычайны) з’езд Саветаў БССР. Прыняцце 3-й Канстытуцыі БССР (“перамогшага сацыялізму”).

**1938 г. – чэрвень 1941 гг.** – трэцяя пяцігодка ў СССР.

**1939 г., 1 верасня** – пачатак Другой сусветнай вайны, нападзенне Германіі на Польшчу.

**1939 г., 17 верасня** – паход войскаў Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну.

**1939 г., 28 верасня** – заключэнне Дагавора аб дружбе і граніцы паміж СССР і Германіяй, паводле якога граніца была праведзена па так званай “лініі Керзана”, вызначанай яшчэ ў 1919 г. Вярхоўным саветам Антанты як усходняя граніца Польшчы. Гэта была этнічная мяжа паміж беларусамі і палякамі.

**1939 г., 28–30 кастрычніка** – работа ў Беластоку Народнага сходу Заходняй Беларусі, які прыняў Дэкларацыі аб дзяржаўнай уладе і ўваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР.

**1939 г., 2 лістапада** – прыняцце Вярхоўным Саветам СССР Закона “Аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад СССР з уз’яднаннем яе з БССР”.

**1939 г., 14 лістапада** – прыняцце Вярхоўным Саветам БССР закона “Аб прыняцці Заходняй Беларусі ў склад БССР”. На тэрыторыі Заходняй Беларусі было ўтворана 5 абласцей – Баранавіцкая, Брэсцкая, Беластоцкая, Вілейская і Пінская.

## Характэрныя тэрміны, паняцці

**Асадніцтва** – інстытут ваенных і цывільных каланістаў, якіх польскі ўрад перасяляў з цэнтральных рэгіёнаў краіны ў Заходнюю

Беларусь, дзе ім даваліся на льготных умовах або бясплатна зямельныя надзелы ў 15–45 га.

**Беларусізацыя** – палітыка нацыянальна-дзяржаўнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў БССР, якая ажыццяўлялася ў 20-я гг. XX ст. Значна паспрыяла развіццю беларускай культуры, мовы, узмацненню нацыянальнай свядомасці беларусаў. Штучна згорнута ў канцы 20-х – пачатку 30-х гг. пад выглядам барацьбы з "нацыянал-дэмакратычнымі ўхіламі".

**Беларуская сялянска-рабочая грамада (БСРГ)** – масавая легальная рэвалюцыйна-дэмакратычная арганізацыя працоўных у Заходняй Беларусі ў 1925–1927 гг. Арганізавана ва ўмовах сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту з мэтай вызвалення Заходняй Беларусі з-пад улады Польшчы. Дзейнасць БСРГ узначальваў старшыня ЦК Б. А. Тарашкевіч, намеснік старшыні С. А. Рак-Міхайлоўскі, члены П. П. Валошын і П. В. Мятла. Праграма БСРГ змяшчала асноўныя дэмакратычныя і асобныя сацыялістычныя патрабаванні: самавызначэнне Заходняй Беларусі і аб'яднанне ўсіх беларускіх зямель у рэспубліку сялян і рабочых (уз'яднанне з БССР); стварэнне сялянска-рабочага ўрада; устанаўленне дэмакратычных свабод; канфіскацыя памешчыцкіх і царкоўных зямель, пераход іх ва ўласнасць дзяржавы і падзел без выкупу паміж малазямельнымі сялянамі і парабкамі; скасаванне асадніцтва; устанаўленне 8-гадзіннага рабочага дня; увядзенне рабочага кантролю ў вытворчасці, развіццё спажывецкай, вытворчай, крэдытнай кааперацыі; нацыянальная роўнасць і навучанне на роднай мове; свабода сумлення і інш.

**"Год великого перелома"** – праграмны артыкул Генеральнага сакратара ЦК УКП(б) І. Сталіна, надрукаваны ў газеце "Правда" 7 лістапада 1929 г., стаў тэарэтычным абгрунтаваннем палітыкі суцэльнай калектывізацыі і адмовы ад паступовай перабудовы вёскі на аснове кааперацыі. У артыкуле сцвярджалася, што нібыта ў 1929 г. большасць сялянаў уступілі ў калектыўныя гаспадаркі, хаця гэта не адпавядала рэчаіснасці. Вызначыў сельскагаспадарчую арцель як асноўнае звяно ў сістэме калгаснага будаўніцтва.

**"Змаганне"** – беларуская дэпутацкая фракцыя польскага сойма ў 1928–1930 гг. Дэпутаты "Змагання" крытыкавалі ўнутраную і знешнюю палітыку польскага ўрада, патрабавалі вызвалення палітычных зняволеных, самавызначэння Заходняй Беларусі, для рабочых 8-гадзіннага працоўнага дня, перадачы сялянам зямлі без выкупу, навучання на беларускай мове. "Змаганне" праводзіла мітынгі і дэман-

страцыі працоўных, выпускала газеты нацыянальна-вызваленчага характару – “Голас Працы”, “На варце”, “Змаганне”, “Світанне” і інш.

**Індустрыялізацыя** – пераўтварэнне СССР у эканамічна незалежную дзяржаву, якая выпрабляе ўсе неабходныя тавары, у першую чаргу сродкі вытворчасці.

**Калгас (калектыўная гаспадарка)** – аб’яднанне сялян у СССР (на аснове грамадскіх сродкаў вытворчасці і калектыўнай працы) для сумеснага вядзення сельскай гаспадаркі. Калгаснікі працавалі на зямлі, што належала дзяржаве, але была перададзена калгасу ў бестэрміновае і бясплатнае карыстанне. Асноўную частку прадукцыі калгас павінен быў здаваць дзяржаве па закупачных цэнах. Калгас трэба адрозніваць ад саўгаса (савецкая гаспадарка) – у асноўным буйных гаспадарак, створаных з мэтаю павелічэння вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. Саўгасы ў асноўным мелі спецыялізацыю на вытворчасці нейкага віду прадукцыі (збожжа, малако, гародніна ці інш.).

**Калектывізацыя** – аб’яднанне аднаасобных сялянскіх гаспадарак у калектыўныя. Стварэнне калектыўных гаспадарак (калгасаў) у розных формах пачалося ў першыя паслякастрычніцкія гады. У 1929 г. у БССР пачаўся пераход да масавай, суцэльнай калектывізацыі, якая праводзілася ў асноўным прымусовымі метадамі.

**Камасацыя** – састаўная частка аграрнай рэформы, абвешчанай польскім сеймам у 1919 г. Праводзілася ў Заходняй Беларусі на падставе законаў 1923 і 1925 гг. Прадугледжвала ліквідацыю цераспалосіцы і стварэнне суцэльных індывідуальных сялянскіх гаспадарак.

**Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ)** – партыя, якая існавала ў 1923–1938 гг. на тэрыторыі Заходняй Беларусі і выступала за ажыццяўленне сацыялістычнай рэвалюцыі ў Польшчы, за права на самавызначэнне для Заходняй Беларусі, за аб’яднанне ўсіх беларускіх зямель у Беларускую савецкую рэспубліку, за ліквідацыю памешчыцкага землеўладання і перадачу зямлі сялянам без выкупу.

**Канцлагер у Бярозе-Картузскай** – канцэнтрацыйны лагер, створаны польскімі ўладамі ў 1934 г. у горадзе Бяроза-Картузская (цяпер г. Бяроза, Брэсцкая вобласць) на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў якасці месца пазасудовага інтэрніравання праціўнікаў кіруючага рэжыму. З 1934 па 1939 г. у ім утрымліваліся па абвінавачванні ў “антыдзяржаўнай дзейнасці” праціўнікі існаваўшага рэжыму. У верасні 1939 г. пасля пачатку вайны з Германіяй у лагеры ўтрымліваліся нямецкія ваеннапалонныя.

**МТС** – машынна-трактарныя станцыі. Пачалі ствараццa ў 1928 г. для падтрымкі калектывізацыі (у БССР першая МТС была створана ў

1930 г. у Койданаўскім р-не). За карыстанне тэхнічнымі сродкамі МТС дзяржава атрымлівала ад калгасаў і саўгасаў натуральную плату збожжам і прадуктамі жывёлагадоўлі. У 1958 г. дзяржава адмовілася ад утрымання МТС, а іх тэхнічная база была перададзена за плату калгасам і саўгасам.

**“Нацыянал-дэмакратызм”** – варожая ідэалогія і практыка, контррэвалюцыйная плынь у многіх установах, якая мела сваёй мэтай “рэстаўрацыю капіталізму” ў рэспубліцы. “Нацыянал-дэмакратаў” (нацдэмаў) параўноўвалі з “нацыянал-фашыстамі”. Вяршыня кампаніі супраць “нацдэмаў” – у 1930 г. была сфабрыкаваная справа “Саюза вызвалення Беларусі” (СВБ).

**НЭП (новая эканамічная палітыка)** – эканамічная палітыка савецкай дзяржавы, разлічаная на пераходны перыяд ад капіталізму да сацыялізму. Сутнасць – выкарыстанне таварна-грашовых адносін. На вёсцы выяўлялася ў замене харчовай развёрсткі харчовым падаткам, свабодзе выбару форм землекарыстання, замене натуральнага падатка грашовым, дазволе арэнды зямлі і найму рабочай сілы. У горадзе – у дазволе прыватнай вытворчасці, арэнды, дэцэнтралізацыі кіравання вытворчасці, матэрыяльнай зацікаўленасці ў выніках працы.

**Парцэляцыя –** продаж праз зямельны банк часткі памешчыцкай і дзяржаўнай зямлі.

**“Прышчэпаўшчына”** – умоўная назва палітыкі ў галіне сельскай гаспадаркі Беларусі ў 20-я гг. Паходзіць ад імя наркама земляробства БССР Дз. Прышчэпава, якога ў 1930 г. абвінавацілі ў насаджэнні хутароў, кулацкіх гаспадарак, супраціўленні калектывізацыі.

**Раскулачванне** – адзін са спосабаў ліквідацыі групы буйных сялянскіх гаспадарак, прадпрымальнікаў вёскі – кулацтва; састаўная частка сацыяльна-класавай палітыкі савецкай улады ў СССР, у тым ліку і ў БССР, у канцы 20-х – пачатку 50-х гг. XX ст. Тэрмін “раскулачванне” азначаў экспрапрыяцыю сродкаў вытворчасці ў заможных сялянскіх гаспадарках. У БССР масавае раскулачванне праводзілася ў 1929–1931 гг., 1939–1941 гг., 1949–1952 гг.

**Санацыя** (лац. *sanatio* – аздараўленне) – дзяржаўна-палітычны рэжым у Польшчы, усталяваны ў выніку майскага дзяржаўнага перавароту 1926 г., на чале якога стаяў Ю. Пілсудскі. Санацыя прадугледжвала стабілізацыю ўнутранай эканамічнай і палітычнай сітуацыі, а таксама карэнныя змены ў знешняй палітыцы Польшчы, якая знаходзілася ў варожых адносінах як з СССР, так і з Германіяй. Дзякуючы папулярнасці асобы Ю. Пілсудскага, яго крытычным адносінам да палітыкі папярэдніх урадаў, усталяваны рэжым спачатку атрымаў пад-

трымку шырокіх мас насельніцтва, у тым ліку ў Заходняй Беларусі. Аднак працяг палітыкі паланізацыі і ўзмацненне рэакцыі вымусілі большасць заходнебеларускіх палітычных дзеячаў выступіць супраць новага курсу.

**Таварыства беларускай школы (ТБШ)** – культурна-асветніцая арганізацыя ў Заходняй Беларусі. ТБШ імкнулася распаўсюджваць і дапамагаць асвеце сярод беларусаў, пашыраць беларускія школы і беларускую асвету.

**Таталітарызм** – агульная назва палітычных (дзяржаўных) сістэм, якія вызначаюцца поўным (татальным) кантролем з боку органаў дзяржаўнай улады над усімі сферамі жыцця грамадства. Характэрная рыса таталітарных рэжымаў – канцэнтрацыя ўсей улады ў дзяржаве ў руках асобнай групы (звычайна палітычнай партыі).

**Узбуйненне БССР** – вяртанне да БССР тэрыторый з большасцю беларускага насельніцтва ў 1924 і 1926 гг. Першае "ўзбуйненне" БССР адбылося ў сакавіку 1924 г. за кошт далучэння да Беларусі паветаў Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў з пераважнай большасцю ў іх беларускага насельніцтва. Другое "ўзбуйненне" БССР адбылося ў снежні 1926 г., калі да Беларусі быў далучаны Гомельскі і Рэчыцкі паветы былой Гомельскай губерні.

**"Усходнія крэсы"** (польск.: kresy – мяжа, канец, край) – афіцыйная назва ў польскіх даваенных дакументах заходне-беларускіх зямель.

**Федэрацыя** – форма дзяржаўнага ўладкавання, пры якой дзяржавы, што ўтвараюць саюз, падпарадкоўваюцца адзінаму цэнтру і пры гэтым захоўваюць самастойнасць у вырашэнні асобных пытанняў унутранай палітыкі. У федэрацыі адзіная канстытуцыя, органы дзяржаўнай улады, грашовыя адзінкі і г. д.

## Гістарычныя асобы

**Галадзед М. М.** – партыйны і дзяржаўны дзеяч БССР, са снежня 1925 г. па май 1927 г. – другі сакратар ЦК КП(б)Б. У 1927–1937 гг. – старшыня СНК БССР. Член ЦВК СССР і БССР (1924–1937). Рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны ў 1956 г.

**Гамарнік Я. Б.** – савецкі военачальнік, дзяржаўны і партыйны дзеяч. У 1928–1929 гг. – першы сакратар ЦК КП(б)Б, ажыццяўляў палітыку калектывізацыі. Пры ім пачаліся беззаконныя рэпрэсіі (арышты, расстрэлы, высылкі). Скончыў жыццё самагубствам. Рэабілітаваны ў 1955 г.

**Жылуновіч Д. Ф.** (псеўданім Цішка Гартны) – прадстаўнік беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, дзяржаўны і грамадскі дзеяч БССР, гісторык, публіцыст, пісьменнік. З 1918 г. сакратар Беларускага нацыянальнага камісарыята (Белнацкома), рэдактар “Дзянніцы” – першай савецкай газеты на беларускай мове. Адзін з галоўных ініцыятараў абвяшчэння незалежнасці БССР, аўтар маніфеста аб яе абвяшчэнні. У студзені 1919 г. – старшыня Часовага ўрада Савецкай Беларусі. Акадэмік АН Беларусі (1928). У 1931 г. абвінавачаны ў “нацыянал-дэмакратызме” і арыштаваны. Памёр у псіхіят-рычнай бальніцы. Поўнасцю рэабілітаваны ў 1987 г.

**Ігнатоўскі У. М.** – беларускі гісторык і грамадскі дзеяч. У 1921–1926 гг. – наркам асветы БССР. Прафесар, дэкан, намеснік рэктара БДУ. З 1926 г. – старшыня Інбелкульта; у 1929–1931 гг. – прэзідэнт Беларускай Акадэміі навук. Аўтар шматлікіх прац па гісторыі Беларусі, сярод якіх “Кароткі нарыс гісторыі Беларусі”. У студзені 1931 г. выключаны з партыі і абвінавачаны ў “нацыянал-ухілізме”. Скончыў жыццё самагубствам. Рэабілітаваны.

**Крыніцкі А. І.** – партыйны і дзяржаўны дзеяч, першы сакратар ЦК КПБ(б) (1924–1927), член ЦК і Бюро ЦК КП(б)Б у 1924–1927 гг., член ЦВК БССР у 1925–1927 гг., з мая 1927 г. – на працы ў ЦК ВКП(б). Значна паспрыяў правядзенню індустрыялізацыі і культурных пераўтварэнняў у БССР. Расстраляны. Рэабілітаваны ў 1956 г.

**Пілсудскі Ю.** – польскі дзяржаўны і палітычны дзеяч, першы кіраўнік незалежнай Польшчы ў 1918–1922 гг., заснавальнік польскай арміі.

**Пічэта У.** – першы рэктар БДУ, аўтар прац па гісторыі славянскіх народаў. Вучань аднаго са стваральнікаў канцэпцыі нацыянальнай гісторыі Беларусі М. Доўнар-Запольскага. Абараніў доктарскую дысертацыю, прысвечаную аграрнай рэформе ў Вялікім Княстве Літоўскім.

**Прытыцкі С.** – палітычны дзеяч Заходняй Беларусі і БССР, лідар КПЗБ. У маладым узросце Сяргей Прытыцкі ўступае ў КСМЗБ. У розны час быў сакратаром Крынкаўскага, Гродзенскага, Слонімскага раённых камітэтаў КСМЗБ. З 1968 па 1971 г. – Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР.

**Прышчэпаў Дз. Ф.** – дзяржаўны і грамадскі дзеяч БССР, народны камісар земляробства БССР (1924–1929), адначасова з 1929 г. намеснік старшыні Дзяржплана БССР. Член КП(б)Б, арыштаваны ў 1930 г. Прыхільнік новай эканамічнай палітыкі на вёсцы, свабоды выбару сялянамі форм землекарыстання. Рэпрэсіраваны. Памёр у турэмнай бальніцы г. Мінска. Рэабілітаваны ў 1988 г.

**Сталін І. В. (сапраўднае прозвішча – Джугашвілі)** – савецкі палітычны, дзяржаўны, ваенны і партыйны дзеяч, адзін з кіруючых дзеячаў КПСС і Савецкай дзяржавы, Генеральны сакратар ЦК РКП(б) – ВКП(б) з 1922 па 1953 г.

**Тарашкевіч Б. А. –** беларускі грамадска-палітычны і асветны дзеяч, мовазнавец, публіцыст, перакладчык, літаратуразнавец. З 1922 г. пасол (дэпутат) сейма Польшчы, узначальваў беларускую парламенцкую фракцыю. Адзін са стваральнікаў і старшыня ЦК Беларускай сялянска-рабочай грамады, аўтар яе праграмы. У студзені 1927 г. арыштаваны польскімі ўладамі. У 1930 г. вызвалены, а ў 1932 г. зноў асуджаны. Да 1930 г. канспіратыўна кіраваў дзейнасцю арганізацый "Змаганне", "Таварыства беларускай школы". У 1933 г. па абмену палітвязнямі пераехаў у СССР. Аўтар першай "Беларускай граматыкі для школ" (1918). Акадэмік АН БССР (1928). Расстраляны ў 1938 г. як "польскі шпіён". Рэабілітаваны ў 1957 г.

**Харужая В. З. –** дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, адзін з арганізатараў Віцебскага партыйнага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Герой Савецкага Саюза (1960).

**Шаранговіч В. Ф.** – партыйны і дзяржаўны дзеяч БССР, удзельнік барацьбы за савецкую ўладу на тэрыторыі Беларусі, грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі 1918–1920 гг. З 1921 па 1926 г. – намеснік наркама юстыцыі БССР, у 1930–1934 гг. – другі сакратар ЦК КП(б)Б, з сакавіка 1937 г. – першы сакратар ЦК КП(б)Б. Рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны ў 1957 г.

## Пытанні для самакантролю

1. Назавіце асаблівасці новай эканамічнай палітыкі ў Беларусі.
2. Якое значэнне для палітычнага і эканамічнага развіцця рэспублікі мела ўзбуйненне яе тэрыторыі ў 1924 і 1926 гг.?
3. Як вы лічыце, з пункту гледжання эканомікі, у чым была неабходнасць сацыялістычнай індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў СССР і БССР?
4. Якія мэты стаялі перад палітыкай індустрыялізацыі?
5. Якія змены адбыліся ў эканоміцы БССР пад час індустрыялізацыі?
6. Якімі метадамі праводзілася калектывізацыя? Якая была рэакцыя сялян на дзеянні ўлад?
7. Да якіх вынікаў прывяла калектывізацыя?

8. Што такое беларусізацыя? Ахарактарызуйце яе асноўныя напрамкі і вынікі.

9. Назавіце прычыны ажыццяўлення палітычных рэпрэсій у СССР і на Беларусі.

10. У чым сутнасць “адміністрацыйнага сацыялізму”?

11. Назавіце імёны гістарычных дзеячаў, якія належалі да рэвалюцыйна-вызваленчага і нацыянальнага руху Заходняй Беларусі.

## Тэма 3. СУВЕРЭННАЯ РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ ВА ЎМОВАХ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ СУСВЕТНЫХ ПРАЦЭСАЎ

1. Крызіс савецкага федэралізму. Абвяшчэнне Рэспублікі Беларусь. Распад СССР і ўтварэнне СНД.
2. Заканадаўча-прававое афармленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. Рэспубліканскія рэферэндумы 1995, 1996 і 2004 гг. і іх вынікі.
3. Геапалітычнае становішча Рэспублікі беларусь ва ўмовах сусветных глабалізацыйных працэсаў. Стратэгія і прынцыпы знешняй палітыкі Беларусі, яе шматвектарнасць на мяжы XX–XXI стст.
4. Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь. Дасягненні і праблемы беларускай эканомікі.
5. Духоўнае і культурнае жыццё беларускага народа на сучасным этапе.

### 1. Крызіс савецкага федэралізму. Абвяшчэнне Рэспублікі Беларусь. Распад СССР і ўтварэнне СНД.

1990 год з’яўляецца пераломным, лёсавызначальным годам у гісторыі СССР, дзяржавы. Нечарговы III з’езд народных дэпутатаў у сакавіку 1990 г. адмяніў 6-ты артыкул Канстытуцыі СССР аб кіруючай ролі КПСС і ўвёў пасаду Прэзідэнта СССР, якім стаў М. С. Гарбачоў. Гэтыя падзеі спрыялі абвяшчэнню суверэнітэту саюзных рэспублік і распаду СССР. Палітычнае і прававое супрацьстаянне паміж Масквой і саюзнымі рэспублікамі стала набываць бесперапынны характар. Яно было выклікана пераўтварэннем СССР з федэратыўнай дзяржавы ва ўнітарную, нераўнамернасцю эканамічнага развіцця саюзных рэспублік, з’яўленнем нацыянальнай інтэлігенцыі, якая гатова была ўзяць на сябе адказнасць за далейшае самастойнае развіццё рэспублік і інш. Першымі аб суверэнітэце заявілі Літва, Латвія і Эстонія. Працэс суве-

рэнізацыі паскорыўся і стаў агульным пасля прыняцця 12 чэрвеня 1990 г. Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце РСФСР.

Важнейшымі зменамі ў грамадска-палітычным жыцці Беларускай ССР у 90-я гг. сталі галоснасць, магчымасць рэалізоўваць дэмакратычныя свабоды слова і друку, страта КПБ манаполіі на ўладу і стварэнне шматпартыйнасці, правядзенне на альтэрнатыўнай аснове выбараў і ўзнікненне парламенцкай апазіцыі ў вярхоўным Савеце БССР. 27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце БССР, у якой Беларусь была вызначана як унітарная, дэмакратычная, сацыяльная і прававая дзяржава. Разам з “Законам аб мовах”. Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце ўвайшла ў лік важнейшых дакументаў 1990 г. Кожны артыкул Дэкларацыі накіраваны на сцвярджэнне нацыянальна-дзяржаўных, палітычных, эканамічных і іншых правоў беларускага народа. Ва ўмовах крызіснай сітуацыі жніўня 1991 г. нечарговая сесія Вярхоўнага Савета БССР прыняла 25 жніўня 1991 г. закон “Аб наданні статусу канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета БССР аб дзяржаўным суверэнітэце БССР”, што азначала юрыдычнае афармленне незалежнасці Беларусі.

19 верасня 1991 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў закон аб назве Беларускай ССР, у адпаведнасці з якім яна пачала называцца Рэспубліка Беларусь (Беларусь). Герб “Пагоня” і бела-чырвона-белы сцяг сталі дзяржаўнымі сімваламі Рэспублікі Беларусь.

8 снежня 1991 г. у Белавежскай пушчы (у рэзідэнцыі Віскулі Брэсцкай вобласці) кіраўнікі Расіі, Украіны і Беларусі (Б. Ельцын, С. Шушкевіч, Л.¸Краўчук), ігнаруючы волю сваіх народаў, якая была выказана на рэферэндуме 17 сакавіка 1991 г., дэнансавалі дагавор 1922 г. аб утварэнні СССР і стварылі Садружнасць Незалежных Дзяржаў.

### 2. Заканадаўча-прававое афармленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. Рэспубліканскія рэферэндумы 1995, 1996 і 2004 гг. і іх вынікі.

Новы статус беларускай дзяржавы, а таксама яе палітычны лад, складванне якога адбывалася на пачатку 90-х гг., патрабавалі афармлення і заканадаўчага замацавання ў Канстытуцыі, падрыхтоўку якой было даручана Канстытуцыйнай камісіі. 15 сакавіка 1994 г. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў новую Канстытуцыю – Асноўны закон Рэспублікі Беларусь. Згодна з ёю Беларусь з’яўляецца ўнітарнай

дэмакратычнай сацыяльнай правовой дзяржавай, якая валодае вяршэнствам і паўнатой улады на сваей тэрыторыі. У рэспубліцы была ўведзена прэзідэнцкая форма кіравання.

Першым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь 10 ліпеня 1994 г. быў выбраны А. Р. Лукашэнка. Для забеспячэння эфектыўнай дзяржаўнай палітыкі была створана падпарадкаваная ўсенародна выбранаму Прэзідэнту скразная вертыкальная структура, якая ўключае выканаўчыя і распарадчыя органы як у цэнтры, так і на месцах.

У мэтах вырашэння некаторых спрэчных пытанняў па ініцыятыве Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 14 мая 1995 г. быў праведзены рэспубліканскі рэферэндум па пытаннях дзяржаўнага статуса беларускай і рускай моў, новай дзяржаўнай сімволікі (герба і сцяга), эканамічнага зближэння (інтэграцыі) з Расіяй, праў Прэзідэнта.

24 лістапада 1996 г. адбыўся другі рэспубліканскі рэферэндум, які адобрыў унясенне дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь і перанясенне Дня незалежнасці з 27 ліпеня на 3 ліпеня. Беларускі народ выказаўся супраць свабоднай, без абмежаванняў куплі-продажу зямлі і адмены смяротнай кары.

У адпаведнасці з новай рэдакцыяй Канстытуцыі Беларусь ператваралася ў прэзідэнцкую рэспубліку з вельмі шырокімі паўнамоцтвамі кіраўніка дзяржавы. Прэзідэнт з’яўляецца гарантам Канстытуцыі, праў і свабод чалавека і грамадзяніна. Выканаўчую ўладу ўзначальвае Прэм’ер-міністр Урада. Новая рэдакцыя Канстытуцыі пашырыла правы і паўнамоцтвы Савета Міністраў. Замест аднапалатнага Вярхоўнага Савета з 260 дэпутатамі быў сфарміраваны двухпалатны парламент – Нацыянальны сход, які з гэтага часу складаецца з Палаты прадстаўнікоў (110 дэпутатаў выбіраюцца насельніцтвам) і Савета Рэспублікі (па 8 чалавек выбіраюцца ад кожнай вобласці і г. Мінска і 8 чалавек прызначаюцца Прэзідэнтам).

Новая рэдакцыя Канстытуцыі аднавіла раўнавагу трох галін улады, усталявала баланс паміж правамі і абавязкамі кіраўніка дзяржавы, павялічыла статус выканаўчай улады ў сістэме дзяржаўных органаў.

17 кастрычніка 2004 г. адбыўся трэці рэферэндум, які адобрыў унясенне дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь (артыкул 81). Адначасова адбыліся свабодныя дэмакратычныя выбары дэпутатаў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

### 3. Геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь ва ўмовах сусветных глабалізацыйных працэсаў. Стратэгія і прынцыпы знешняй палітыкі Беларусі, яе шматвектарнасць на мяжы XX–XXI стст.

Традыцыі беларускай дзяржаўнасці, якія апіраюцца на шматгадовы вопыт узаемадносін з суседнімі дзяржавамі, вызначыла шматвектарнасць беларускай знешняй палітыкі і імкненне нашага народа да міру і згоды. За апошняе дзесяцігоддзе дзяржава змагла стварыць устойлівую ўзаемавыгадную мадэль супрацоўніцтва з большасцю краін свету, аптымальна збалансаваць свае інтарэсы паміж рознымі палітычнымі сіламі. Базавымі прынцыпамі знешняй палітыкі Беларусі сталі бяз’ядзернасць, нейтралітэт і захаванне міру.

Суседзямі Рэспублікі Беларусь з’яўляюцца Расійская Федэрацыя, Украіна, Польшча, Літва і Латвія. Пасля прызнання Рэспублікі Беларусь як суверэннай дзяржавы з гэтымі краінамі былі падпісаны дагаворы аб дзяржаўных граніцах. 26 лютага 1992 г. Рэспубліка Беларусь падпісала Хельсінкскі Заключны акт. З гэтага моманту яна не толькі стала раўнапраўнай удзельніцай хельсінкскага працэсу, але і нясе разам з іншымі дзяржавамі адказнасць за захаванне міру і бяспекі ў Еўропе.

Рэспубліка Беларусь далучылася да Дагавора аб скарачэнні войскаў у Еўропе. Яна зменшыла колькасць агульных узбраенняў і поўнасцю вывела са сваёй тэрыторыі тактычную ядзерную зброю. Рэспубліка Беларусь – нейтральная бяз’ядзерная дзяржава ў цэнтры Еўропы.

Асноўнымі накірункамі знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь на мяжы XX–XXI стст. сталі: палітычныя і эканамічныя сувязі з краінамі Садружнасці Незалежных Дзяржаў, перш-наперш з Расійскай Федэрацыяй ва ўмовах існавання саюзнай дзяржавы; краінамі Еўрапейскага саюза, арабскім дзяржавамі; вядучай дзяржавай Азіяцкага рэгіёна – Кітаем; краінамі Афрыкі і Лацінскай Амерыкі.

Адносіны з Расіяй прайшлі шлях ад асобных дагавароў да пагаднення аб стварэнні Саюзнай дзяржавы 8 снежня 1999 г. Беларуска-расійская інтэграцыя ўзнялася на якасна новую ступень. Па выніках 2014 г. двухбаковы тавараабарот склаў 37,6 млрд. долараў. На долю Расіі прыходзіцца 48,8 % аб’ёму знешняга гандлю. Беларусь увайшла ў пяцёрку асноўных партнёраў Расіі. Саюзная дзяржава застаецца лакаматывам інтэграцыі на постсавецкай прасторы і прыкладам поспеху для дзяржаў рэгіёна. Наработаны ў рамках саюзнай дзяржавы вопыт інтэграцыйных адносін актыўна выкарыстоўваецца ў Еўразійскім эканамічным саюзе.

Традыцыйна важным кірункам знешняй палітыкі застаецца рэгіён СНД. Адносіны з усімі краінамі – членамі Садружнасці – характарызуюцца актыўным палітычным дыялогам і насычанымі эканамічнымі сувязямі. Сярод буйнейшым экспартных пазіцый нафтапрадукты, калійныя і азотныя ўгнаенні, металапракат, трактары, грузавыя аўтамабілі, аўтобусы, мэбля, мясная і малочная прадукцыя, цукар і інш. Беларусь – трэці ў свеце экспарцёр калійных угнаенняў, займае 30 % сусветнага рынка кар’ерных самасвалаў, 10 % рынка трактараў і 7 % рынка камбайнаў. Найбольш значымым эканамічным партнёрам застаецца Украіна, тавараабарот з якой ў 2014 г. склаў 5,8 млрд. долараў (7 % ад усяго аб’ёму беларускага гандлю). Паступова ўмацоўваюцца адносіны з Казахстанам, якія дапаўняюць наша супрацоўніцтва ў Еўразійскім эканамічным саюзе. На сучасным этапе ў гэтай краіне збіраецца беларуская кар’ерная і шахтная тэхніка, трактары, камбайны, ліфты і інш. Актыўны імпульс нададзены беларуска-туркменскім адносінам, сярод якіх найбольш значымым праектам з’яўляецца будаўніцтва беларускімі спецыялістамі Гарлыкскага горна-абагашчальнага комплекса па выпуску калійных угнаенняў (у 2015 г. была дабыта першая тона калійнай руды). Узвядзенне камбіната стымулявала цікавасць да супрацоўніцтва ў сферы адукацыі – больш 9 тыс. прадстаўнікоў Туркменістана вучацца ў нашай краіне.

Рэспубліка Беларусь развівае гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва не толькі з краінамі СНД, але і з дзяржавамі далёкага замежжа. У яе знешняй палітыцы выразна вызначыліся ўсходні і заходні вектары. Важнымі гандлёвымі партнёрамі Беларусі з’яўляюцца еўрапейскія краіны, у іх ліку Германія, Велікабрытанія, Польшча, Нідэрланды, Літва, Латвія і інш. З 2009 г. Бларусь – актыўны ўдзельнік шматбаковага вымярэння ініцыятывы ЕЭС “Восточное партнерство”. У якасці пазітыўных крокаў у нашых адносінах у 2015 г. можна назваць далучэнне Беларусі да Балонскага працэсу.

Паспяхова развіваюцца палітычныя і гандлёва-эканамічныя сувязі паміж Рэспублікай Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікай. Краіны маюць аднолькавыя ці блізкія погляды на праблемы развіцця сусветнай цывілізацыі, падтрымліваюць адзін аднаго ў міжнародных арганізацыях. У 2015 г. паміж імі падпісана больш 60 дакументаў, умоўны кошт якіх перавышае 11 млрд. долараў. Станоўчы вопыт назапашаны ва ўзаемаадносінах паміж Рэспублікай Беларусь і такімі аўтарытэтнымі краінамі Азіі з магутным вытворча-эканамічным патэнцыялам, як Індыя, Іран, Пакістан, В’етнам і інш.

Пашыраюцца сувязі з такімі краінамі, як Аргентына, Бразілія, Куба, Венесуэла. У Венесуэле пры ўдзеле беларускага боку пабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю сумесныя прадпрыемствы па зборцы трактараў, грузавых аўтамабіляў, дарожнай тэхнікі.

У краінах Афрыкі Беларусь робіць акцэнт на ўзаемадзеянне з буйнейшымі эканомікамі ЮАР, Нігерыі, Судана і інш. Перспектыўнымі партнёрамі для Беларусі з'яўляюцца Ангола, Алжыр, Марока.

Развіваецца супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь і замежных краін у галіне навукі, літаратуры і мастацтва. Гэта сумесныя распрацоўкі беларускімі і замежнымі вучонымі навукова-даследчых тэм, пераклад і выданне за мяжой твораў беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, гастролі майстроў беларускай сцэны і дэманстрацыя работ беларускіх мастакоў і скульптараў у іншых краінах і г. д.

Калі 20 гадоў назад Беларусь была прадстаўлена за мяжой 23 замежнымі ўстановамі, то к 2015 г. – гэта 67 дыппрадстаўніцтваў і консульскіх устаноў у 56 дзяржавах свету. Асабліва важна, што кожны з вектараў беларускай знешняй палітыкі ўлічвае інтарэсы ўсіх партнёраў. Сёння можна канстатаваць, што за гады незалежнасці Беларусь сталі ведаць у свеце як суверэнную незалежную дзяржаву, міралюбівую еўрапейскую краіну, выступаючую за бяспеку і стабільнасць у рэгіёне. Рэспубліка Беларусь з'яўляецца актыўным членам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, Еўразійскага эканамічнага саюза.

### 4. Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь. Дасягненні і праблемы беларускай эканомікі.

Беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага інавацыйнага развіцця сфарміравалася ў час правядзення рыначных рэформ новым кіраўніцтвам Рэспублікі Беларусь, пачынаючы з 1994 г. Неабходна адзначыць, што беларуская мадэль тычыцца не толькі і не столькі эканомікі, яна ўяўляе сабой комплекс сацыяльна-палітычных прынцыпаў, пакладзеных у аснову нашага дзяржаўнага развіцця. Важнымі яе рысамі з'яўляюцца: сацыяльная накіраванасць, непарыўнасць і пераемнасць гістарычнага развіцця грамадства, недапушчэння сацыяльнага расслаення, абарона інтарэсаў малазабяспечаных слаёў насельніцтва і інш.

Па-першае, гэта звязана з тым, што ва ўмовах глабалізацыі, жорсткай канкурэнтнай барацьбы за рынкі збыту і сыравінныя рэсурсы, пабудовы новага постіндустрыяльнага інфармацыйнага грамадства

важнейшым рэсурсам эканамічнага развіцця становіцца высокаадукаваны, фізічна здаровы і ўсебакова развіты чалавек, здольны працаваць на карысць краіны, генерыраваць новыя ідэі і паспяхова іх ажыццяўляць. Таму ў цэнтры беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця знаходзіцца чалавек, яго здароўе, адукацыя, зарплата, жыллё, пенсія, бяспека. Дзяржава клапоціцца аб росце заработнай платы, пенсій, стыпендый і іншых выплат насельніцтву, паляпшэнні жыллёвых умоў, працы і адпачынку з тым, каб чалавек адчуваў сябе камфортна, ганарыўся тым, што жыве і працуе ў краіне, імя якой Рэспубліка Беларусь.

Па-другое, новае кіраўніцтва дзяржавы адмовілася ад ліберальнай мадэлі рынку і ўзяло на ўзбраенне сацыяльна-інавацыйную мадэль рыначнай эканомікі. Выкарыстоўваючы яе, дзяржава праводзіць моцную і эфектыўную эканамічную і сацыяльную палітыку, абараняе інтарэсы ўсіх класаў і слаёў насельніцтва.

Па-трэцяе, улічваючы вопыт краін з развітай рыначнай інфраструктурай, Рэспубліка Беларусь стала на шлях дзяржаўнага рэгулявання эканомікі, што забяспечвае павышэнне эфектыўнасці эканомікі, абарону інтарэсаў айчынных таваравытворцаў, недапушчэнне «праядання» крэдытаў, узмацнення інфляцыі, развіцця крымінальных і ценявых структур.

Па-чацвёртае, прыпынена раскраданне агульнанароднага багацця і стварэнне буйных прыватных капіталаў; прыватызацыя праводзіцца пры ўдзеле і пад кантролем дзяржавы, у інтарэсах умацавання яе магутнасці і павышэння дабрабыту народа.

Па-пятае, народ і дзяржава адмовіліся ад куплі-продажу зямель сельскагаспадарчага прызначэння, ад дэмантажу буйной калгасна-саўгаснай вытворчасці і замены яе сялянскай (фермерскай) гаспадаркай. Сельскагаспадарчае прадпрыемства (кааператыў, аграфірма, агракамбінат і інш.), сялянская (фермерская) гаспадарка маюць роўныя правы і магчымасці існавання, калі яны эфектыўна гаспадараць на зямлі.

Па-шостае, Рэспубліка Беларусь адкрыта для эканамічнага супрацоўніцтва з усімі краінамі свету. Яна прыцягвае ў народную гаспадарку капіталы айчынных і замежных інвестараў, але сёння, пры наяўнасці велізарнага вытворча-эканамічнага, навукова-тэхнічнага і інтэлектуальнага патэнцыялу, стаўка робіцца на ўласныя сілы і сродкі, а іншаземныя інвестыцыі прыцягваюцца ў тым выпадку, калі яны даюць нам эканамічную выгаду і адпавядаюць нацыянальным інтарэсам.

Вынікамі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь у

2010–2015 гг. стала тое, што ў краіне створана і дзейнічае аптымальная сацыяльна-эканамічная сістэма, заснаваная на паступовым, эвалюцыйным шляху эканамічных пераўтварэнняў. Краіна захавала багацце, створанае працай усяго народа, не прадала за бясцэнак зямлю, заводы і фабрыкі, не мае даўгавых абавязацельстваў перад замежнымі крэдыторамі, паглыбіла сацыяльныя гарантыі для людзей: жыллё, пенсіі, бясплатныя за кошт бюджэту адукацыя і лячэнне.

У сферы сельскай гаспадаркі сёння выкарыстоўваюцца новыя падыходы, дзе наша краіна дасягнула значымых поспехаў. Беларусь практычна поўнасцю забяспечвае сябе прадуктамі харчавання (імпарт складае меньш за 10 %, а сельскагаспадарчую прадукцыю мы экспартуем больш чым у 50 краін).

Для Беларусі адзіная прамысловая палітыка, маштабная кааперацыя Еўразійскага Эканамічнага Саюза (ЕАЭС) – галоўны прыярытэт. У 2015 г. у Сочы адбыўся другі Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, прысвечаны пытанням прамысловай палітыкі. Галоўным напрамкам стратэгіі становіцца стварэнне новага высокавытворчага сектара эканомікі і мадэрнізацыя базавай эканомікі, якая ахоплівае многія сферы дзейнасці грамадства: усебаковае гарманічнае развіццё чалавека на аснове павышэння рэальных грашовых даходаў, удасканалення сістэм адукацыі, аховы здароўя і іншых галін сферы паслуг; інавацыйны шлях развіцця эканомікі, энерга- і рэсурсазберажэнне; развіццё аграпрамысловага комплексу і сацыяльнае адраджэнне сяла; развіццё малых і сярэдніх гарадоў; жыллёвае будаўніцтва.

Галоўнай мэтай сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2015–2020 гг. з’яўляецца далейшы рост узроўню і якасці жыцця насельніцтва на аснове мадэрнізацыі эканомікі, развіцця унутранага рынку, удасканаленні сістэмы кіравання эканомікай, павышэння канкурэнтаздольнасці эканомікі, павелічэня экспартнага патэнцыялу краіны на аснове павышэння канкурэнтаздольнасці айчыннай прадукцыі. Асаблівасцю выпрацоўкі праграм эканамічнага развіцця і іх зацверджання стала практыка абмеркавання іх на Усебеларускіх Народных сходах (1996, 2001, 2006, 2010).

Комплекс мер па рашэнню задач сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў 2016 г. і макраэканамічнай збалансаванасці, распрацаванай у канцы 2015 г. Урадам і Нацбанкам, прадугледжвае развіццё Нацыянальнай праграмы падтрымкі і развіцця экспарту на 2016–2020 гг., рэалізацыю сумесных інвестпраектаў у межах межрэгіянальнага кітайска-беларускага супрацоўніцтва для далучэння кожным з сямі рэгіенаў Беларусі не менш 100 млн. долараў, падтрымку суб’ектаў малога і

сярэдняга бізнесу, распрацоўку праекта дзяржпраграмы “Энергазберажэнне” на 2016–2020 гг. і праграмы развіцця Беларускай энергетычнай сістэмы, падрыхтоўку комплекснай стратэгіі рэфармавання і рэструктурызацыі дзяржпрадпрыемстваў і інш. На сучасным этапе ў беларускай эканамічнай палітыцы галоўным з’яўляецца не хуткая і масавая прыватызацыя буйных прадпрыемстваў, а лібералізацыя іх дзейнасці, пашырэнне правоў, спрашчэнне падаткавай сістэмы, прадстаўленне аднолькавых магчымасцей для любога бізнеса незалежна ад форм уласнасці, удзел дзяржавы ў забеспячэнні эфектыўнасці эканомікі пры зберажэнні ключавых галін прамысловасці, рэгуляванні даходаў насельніцтва і яго занятасці, задавальненні сацыяльных патрэб у сферы адукацыі, аховы здароўя і культуры.

**5. Духоўнае і культурнае жыццё беларускага народа на сучасным этапе.**

У Рэспубліцы Беларусь на мяжы XX–XXI стст. была створана ўстойлівая сістэма адукацыі і навукі. Гэта з’яўляецца падмуркам сацыяльна-эканамічнага, навукова-тэхнічнага і культурнага развіцця нашай краіны ва ўмовах паступовага станаўлення інфармацыйнага грамадства. У 90-я гг. XX ст. у Рэспубліцы Беларусь пачала праводзіцца рэформа агульнаадукацыйнай школы, звязаная з пераходам на 12-гадовы тэрмін навучання ў сярэдняй школе. Яна прадугледжвала пераход да абавязковай 10-гадовай базавай школы, спецыялізаваную падрыхтоўку вучняў па розных кірунках (прыродазнаўча-матэматычным, гуманітарным, тэхналагічным, агульнаадукацыйным). Аднак рэформа сябе не апраўдала і ў 2008 г. было прынята рашэнне аднавіць 11-гадовую сярэднюю школу.

Асаблівасцю развіцця сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь на мяжы XX–XXI стст. у 90-я гг. стала дзейнасць недзяржаўных навучальных устаноў, якія існуюць разам з дзяржаўнымі. Прыярытэтным для нашай краіны з’яўляецца фарміраванне эканомікі ведаў. У 2011 г. быў прыняты Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі. Беларусь, згодна дадзеным Сусветнага банка 2015 г., сярод 140 дзяржаў свету па значэнні індэкса эканомікі ведаў уваходзіць у лік перш 50-ці, у СНД займае трэцяе месца па ўзроўню адукацыі і па інфармацыйна-камунікатыўным тэхналогіям – абсалютны лідар.

Беларускія вучоныя ажыццяўляюць шэраг важных даследаванняў практычна ва ўсіх галінах ведаў. Паступова аднаўляюцца страчаныя раней сувязі з вучонымі Расіі і краін былога СССР, ажыццяўляюцца кантакты з навуковай супольнасцю замежных краін. Развіццё навукі

павінна забяспечыць устойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь, павышэнне ўзроўню жыцця насельніцтва. На канец 2015 г. навуковы патэнцыял Беларусі складае больш за 480 арганізацый, у якіх працуе каля 29 тыс. чалавек, у тым ліку больш 18 тыс. даследчыкаў. Навучанне ў аспірантуры штогод праходзяць больш за 5 тыс. чалавек. Толькі за 2014 г. вучонымі і спецыялістамі НАН Беларусі створана 98 абразцоў машын і абсталявання, больш 150 новых матэрыялаў, 40 відаў раслін і парод жывёл і інш. Беларускія вучоныя актыўна супрацоўнічаюць з 90 замежнымі акадэміямі і навуковымі цэнтрамі.

Змены ў сацыяльна-эканамічным і грамадска-палітычным жыцці Беларусі знайшлі адлюстраванне ў літаратуры. Палітыка галоснасці і дэмакратызацыі жыцця спрыяла з'яўленню твораў, прысвечаных праблемам асэнсавання гістарычнага шляху беларускага народа. Вызначальнай рысай у развіцці мастацтва стала нацыянальна-культурнае адраджэнне. Адлюстраванне ў беларускай літаратуры і мастацтве беларускай тэматыкі садзейнічала асэнсаванню сучаснасці ў спалучэнні з традыцыямі гістарычнага мінулага, захаванню культурна-гістарычнай спадчыны сваіх продкаў. Былі апублікаваны аповесці В. Быкава ("Балота"), І. Навуменкі ("Любімы горад"), Л. Дайнекі ("Жалезныя жалуды"), М. Чаргінца ("Операция "Кровь"), Н. Батраковай ("Террритория души") і інш. Новыя творы з'явіліся ў беларускіх паэтаў Г. Бураўкіна ("Жураўліная пара"), А. Салтука (зборнік вершаў "Не разлюбі"), С Законнікава ("Шалёная куля: паэзія пяці гадоў"), Р. Баравіковай (паэма "Барбара Радзівіл") і інш.

У 2015 г. лаўрэатам Нобелеўскай прэміі ў галіне літаратуры стала беларуская пісьменніца Святлана Алексіевіч – аўтар кніг "У войны не женское лицо", "Последние свидетели", "Цинковые мальчики", "Зачарованные смертью", "Чернобыльская молитва", "Последние свидетели. Соло для детского голоса" і "Время сэконд-хэнд".

У складаных эканамічных умовах сярэдзіны 1980–1990-х гг. развівалася тэатральнае мастацтва Беларусі. У 1990-я гг. узніклі новыя прафесійныя і аматарскія драматычныя тэатры. Галоўную ролю ў тэатральным мастацтве адыгрывалі прафесійныя дзяржаўныя калектывы. Сёння ў Беларусі дзейнічае больш за 25 тэатраў. У 2014 г. завершана рэканструкцыя Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь.

Далейшае развіццё атрымала музычнае мастацтва. Шмат зрабілі і робяць для росквіту музычнай культуры Беларусі такія вядомыя

кампазітары, кіраўнікі музычных калектываў і выканаўцы, як В. Роўда, М. Дрынеўскі, М. Казінец, С. Картэс, Дз. Смольскі, У. Солтан, В. Елізар'еў, А. Мдзівані і інш.

Актыўнай канцэртнай дзейнасцю займаюцца сёння Беларуская дзяржаўная філармонія і абласныя філармоніі. Беларусь, Украіна і Расія штогод, пачынаючы з 1992 г., сумесна праводзяць свята песні "Славянскі базар" у Віцебску. Уздыму ўзроўню майстэрства маладых выканаўцаў садзейнічае фестываль у Маладзечна, які з 1993 г. стаў традыцыйным. Магілёў па праву лічыцца культурнай сталіцай – там праводзяцца фестывалі "Залаты шлягер", "Магутны божа".

Актыўна развіваецца беларускае кінамастацтва. Папулярнасць заваявалі такія фільмы, як "Анастасія Слуцкая" (рэжысёр Ю. Ялхаў), "У чэрвені 1941-га" (М. Пташук), "Дняпроўскі рубеж" (Д. Скварцоў). У Мінску праводзіцца міжнародны фестываль "Лістапад" і міжнародны фестываль дзіцячага і юнацкага кіно "Лістападзік".

У беларускай скульптуры назіраецца зварот да гістарычнай тэматыкі. Так, былі ўстаноўлены помнікі Кірылу Тураўскаму ў Тураве, Францыску Скарыне ў Лідзе і Мінску, Рагнедзе і Ізяславу ў Заслаўі, Еўфрасінні Полацкай у Мінску і Рэчыцы. Актыўна развіваецца паркавая скульптура "малых форм" (А. Купрыянаў, У. Жбанаў).

Адной з важных задач палітыкі дзяржавы з'яўляецца захаванне помнікаў айчыннай гісторыі і культуры. У апошнія гады ў рэспубліцы праводзіцца работа па вяртанні гісторыка-культурнай спадчыны і па рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Маштабныя рэстаўрацыйныя работы праводзіліся ў Мірскім замку ў канцы 1980-х–1990-я гг. Пастановай Савета Міністраў Нясвіжу быў нададзены статус Нацыянальнага запаведніка Рэспублікі Беларусь. Надзвычайную каштоўнасць для Беларусі мае Полацкі гісторыка-культурны запаведнік. Вядзецца рэстаўрацыя помнікаў архітэктуры на Навагрудчыне, Лідскага замка, Барысаглебскай (Каложскай) царквы і Старога Замка ў Гродне, Благавешчанскай царквы ў Віцебску, гістарычнай забудовы старажытнабеларускіх гарадоў. У Мінску на плошчы Свабоды быў аднаўлены будынак ратушы. Было пабудавана новае памяшканне для Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, адкрыццё якога адбылося ў 2006 г. У спісе сусветнай спадчыны ЮНЕСКА знаходзіцца больш за 900 аб'ектаў, з іх у Беларусі – Белавежская пушча, замкавы комплекс Мір, рэзідэнцыя Радзівілаў у Нясвіжы, геадэзічная дуга Струве.

У 2014 г. у новым будынку пачаў дзейнічаць Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны – буйнейшае ў Беларусі схо-

вішча рэліквій Вялікай Айчыннай вайны і адзін з важнейшых цэнтраў грамадска-патрыятычнага выхавання.

Вялікае значэнне ў Беларусі надаецца аб’ектам фізкультурна-спартыўнага прызначэння. Нашы спартсмены дастойна прадстаўляюць сваю краіну на спаборніцтвах рознага ўзроўню. Так, на апошніх Алімпійскіх гульнях 2014 г. у Сочы беларусы заваявалі 5 залатых медалёў (біятланістка Д. Домрачава тры разы падымалася на п’едэстал, чэмпіёнамі сталі фрыстайлісты А. Кушнір і А. Цупер).

У мэтах аб’яднання інтэлектуальных і духоўных сіл грамадства для рашэння задач сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, захавання гісторыка-культурнай спадчыны, развіцця народных традыцый, выхавання ў грамадзян любові да Айчыны, а таксама для падтрымкі творчых ініцыятыў 2016 год абвешчаны ў Беларусі годам культуры.

## Пытанні для самакантролю

1. Раскрыйце прычынна-выніковую сувязь паміж наступнымі падзеямі: распад СССР, стварэнне СНД.
2. У БССР на рэферэндуме ў сакавіку 1991 г. за захаванне СССР прагаласавала больш за 82 % выбаршчыкаў. Растлумачце, чаму волевыяўленне народа не было ажыццёўлена.
3. Калі ў Рэспубліцы Беларусь была прынята сучасная дзяржаўная сімволіка? Растлумачце, што абазначаюць яе элементы.
4. Вызначце, якія прынцыпова важныя змены былі ўнесены ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь 1994 г. па выніках рэспубліканскага рэферэндуму 1996 г.
5. Чаму пасля распаду СССР эканоміка Беларусі апынулася ў цяжкім становішчы?
6. У чым асаблівасці беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага іннавацыйнага развіцця?
7. Пералічыце найбольш значныя дасягненні, арганізатары і ўдзельнікі якіх былі ўдастоены звання «Герой Беларусі».
8. Раскажыце аб вытоках беларуска-расійскага адзінства. Якое значэнне мае Саюз Беларусі і Расіі для нашых народаў?
9. Як вы думаеце, чаму Рэспубліка Беларусь абвясціла сябе бяз’ядзернай дзяржавай? Што гэта азначае на практыцы?
10. Якія змены адбыліся ў становішчы Беларусі на міжнароднай арэне пасля распаду СССР? У якія міжнародныя арганізацыі ўваходзіць сёння Беларусь?

## Важнейшыя падзеі

**1922 г., 30 снежня** – I Усесаюзны з’езд Саветаў. Прыняцце Дэкларацыі і дагавору аб утварэнні СССР. Першапачаткова ў склад СССР увайшлі РСФСР, УССР, БССР, ЗСФСР

**1990 г., 27 ліпеня –** прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР.

**1991 г., 25 жніўня –** наданне канстытуцыйнага статусу Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР.

**1991 г., 19 верасня** – замена назвы “БССР” на назву “Рэспубліка Бе-ларусь” і зацвярджэнне нацыянальнай сімволікі (герб “Пагоня”, бела-чырвона-белы сцяг).

**1991 г., 8 снежня** – падпісанне пагадненняў аб дэнансацыі СССР і стварэнні СНД.

**1994 г., 15 сакавіка** – прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

**1994 г., 10 ліпеня** – першыя прэзідэнцкія выбары, Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь абраны А. Р. Лукашэнка. Выбары адбываліся ў 2001, 2006, 2010 і 2015 гг.

**1995 г., 14 мая** – рэспубліканскі рэферэндум па пытаннях дзяржаўнага статуса беларускай і рускай моў, новай дзяржаўнай сімволікі (герба і сцяга), эканамічнай інтэграцыі з Расіяй, праў Прэзідэнта.

**1996 г., 24 лістапада** – рэферэндум, які адобрыў унясенне дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь і перанясення Дня незалежнасці з 27 ліпеня на 3 ліпеня.

**1999 г., снежань** – падпісанне паміж Беларуссю і Расіяй Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы.

**2002 г.** – прыняцце Дзяржаўнага Гімна Рэспублікі Беларусь.

**2004 г., 17 кастрычніка** – рэферэндум, які адобрыў унясенне дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, артыкул № 81.

**1996, 2001, 2006, 2010 гг.** – адбыліся Усебеларускія Народныя сходы, на якіх былі вызначаны галоўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

**2006 г.** – адкрыццё Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў новым будынку, які ўяўляе сабой ромбакубаактаэдар, мае незвычайнае падсвятленне, якое працуе штодённа ад захода сонца да 24 гадзін. Яго колер і ўзоры змяняюцца штосекундна.

**2010 г., лістапад** – прыняцце Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2011–2015 гг.

**2011 г.,** – прыняцце Дзяржаўнай праграмы ўстойлівага развіцця вёскі на 2011–2015 гг.

**2013 г., красавік** – пасланне Прэзідэнта А. Р. Лукашэнкі беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу “Обновление страны – путь к успеху и расцвету”.

**2014 г. –** канцэпцыя комплекснага прагноза навукова-тэхнічнага прагрэса Рэспублікі Беларусь на 2016–2020 гг. і на перыяд да 2030 г.

**2014 г., красавік** – пасланне Прэзідэнта А. Р. Лукашэнкі беларускаму народу “Сильная экономика и честная власть – фундамент независимости страны и процветания нации”.

**2015 г., красавік** – пасланне Прэзідэнта А. Р. Лукашэнкі беларускаму народу и Нацыянальнаму сходу “Мир и развитие”.

**2015 г.** – Праграма сацыянальна-эканамічнага развіцця на 2016–2020 гг. У 2010 г. быў створаны Мытны саюз Расіі, Беларусі і Казахстана. Ён прадугледжвае адзіную мытную тэрыторыю, у межах якой ва ўзаемным гандлі таварамі не прымяняюцца мытныя пошліны і абмежаванні эканамічнага характару, ужываецца адзіны мытны тарыф і інш., адзіныя меры рэгулявання гандлю таварамі з трэцімі краінамі. Практычная дзейнасць гэтага саюза пачала ажыццяўляцца з 1 студзеня 2014 г.

## Характэрныя тэрміны, паняцці

**Аграгарадок** – добраўпарадкаваны пасёлак у сельскай мясцовасці. Тэрмін з’явіўся ў сувязі з прыняццем “Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця сяла на 2005–2010 гг.” Аграгарадок вызначаецца як якасна новы тып сельскіх пасёлкаў, у якіх будуць створаны вытворчая і сацыяльная інфраструктуры для забеспячэння сацыяльных стандартаў пражывання насельніцтва.

**АДКБ (Арганізацыя Дагавора аб калектыўнай бяспецы)** – ваенна-палітычны саюз, створаны ў 2003 г., у які ўваходзяць 7 краін СНД, у тым ліку і Беларусь.

**Глабалізацыя** – філасофска-культуралагічная інтэгратыўная канцэпцыя, у межах якой сцвярджаецца, што сучаснае грамадства – гэта цэласны і ўзаемазвязаны арганізм, што пастаянна сутыкаецца з неабходнасцю плюралізму пры вырашэнні глабальных праблем сучаснасці.

**Дзяржава прававая** – прававая форма арганізацыі і дзейнасці публічнай палітычнай улады і яе ўзаемаадносін з індывідамі як суб’ектамі права.

**Дзяржава сацыяльная** – дзяржава, якая імкнецца забяспечыць кожнаму грамадзяніну належныя ўмовы існавання, сацыяльнай абароненасці, саўдзельніцтва ў кіраванні вытворчасцю.

**Дэмакратыя** – форма (разнавіднасць) грамадскай улады, дзяржава, заснаваная на прызнанні народа ў якасці крыніцы ўлады.

**Дзяржбюджэт** – расклад грашовых даходаў і расходаў краіны.

**Ідэалогія беларускай дзяржавы** – сукупнасць ідэй і ідэалаў, якія адлюстроўваюць нацыянальна-гістарычныя традыцыі і каштоўнасці беларускага народа, адпавядаюць мэтам і асаблівасцям развіцця беларускага грамадства.

**Інавацыя** – гэта ўкаранёнае новаўвядзенне, якое забяспечвае якасны рост эфектыўнасці працэсаў або прадукцыі, запатрабаванае рынкам. З'яўляецца канчатковым вынікам інтэлектуальнай дзейнасці чалавека, яго фантазіі, творчага працэсу, адкрыццяў, вынаходак і рацыяналізацыі.

**Інвестыцыі** – доўгатэрміновыя ўкладанні капіталу ў галіны эканомікі ўнутры краіны і за мяжой.

**Інтэграцыя** – працэс, вынікам якога з'яўляецца дасягненне адзінства і цэласнасці, узгодненасць унутры сістэмы, заснаванай на ўзаемасувязі і ўзаемадапаўняльнасці асобных спецыялізаваных элементаў.

**Канстытуцыя –** асноўны закон дзяржавы, які мае вышэйшую юрыдычную сілу і вызначае дзяржаўны лад, выбарчую сістэму, прынцыпы арганізацыі і дзейнасці дзяржаўных органаў і асноўныя правы і абавязкі грамадзян.

**Мадэрнізацыя –** працэс поўнай ці частковай рэканструкцыі грамадскай сістэмы з мэтай паскарэння развіцця.

**Мытны саюз Расіі, Беларусі і Казахстана –** створаны ў 2010 г., прадугледжвае адзіную мытную тэрыторыю, у межах якой ва ўзаемным гандлі таварамі не прымяняюцца мытныя пошліны і абмежаванні эканамічнага характару, ужываецца адзіны мытны тарыф і інш., адзіныя меры рэгулявання гандлю таварамі з трэцімі краінамі.

**Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь –** Парламент – прадстаўнічы і заканадаўчы орган улады з 1996 г. Складаецца з дзвюх палат: Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі. У Палаце прадстаўнікоў – 110 дэпутатаў. Выбранне ажыццяўляецца на аснове ўсеагульнага, свабоднага, роўнага, прамога выбарчага права пры тайным галасаванні. Савет Рэспублікі – палата тэрытарыяльнага прадстаўніцтва. Ад кожнай вобласці і г. Мінска тайным галасаваннем выбіраюцца на пасяджэннях дэпутатаў мясцовых Саветаў па восем членаў Савета Рэспублікі. Таксама восем членаў Савета Рэспублікі назначае Прэзідэнт.

**Парк высокіх тэхналогій –** навукова-вытворчае аб’яднанне для развіцця беларускай навукі, укаранення інфармацыйных тэхналогій у прамысловасць і інш.

**Постіндустрыяльнае грамадства** – грамадства, у якім сфера паслуг атрымала прыярытэтнае развіццё і пераўзыходзіць над аб’ёмам прамысловай вытворчасці і аб’ёмам вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі.

**Рэферэндум** – усенароднае галасаванне па найважнейшых пытаннях развіцця краіны. У Беларусі Рэферэндумы праводзіліся тройчы: у 1995, 1996 і 2004 гг.

**Рынaчная эканоміка** – сістэма арганізацыі гаспадаркі, заснаваная на свабодным прадпрымальніцтве, канкурэнцыі і розных формах уласнасці на сродкі вытворчасці.

**Сацыяльна арыентаваная іннавацыйная эканоміка –** мадэль эканамічнага развіцця, пры якой існуюць дзяржаўны і прыватны сектары эканомікі, а дзяржава займае вызначальную ролю ў рэгуляванні эканамічных працэсаў і фарміраванні ўмоў для забеспячэння патрэб насельніцтва.

**«СКІФ»** – суперкампутар, створаны у выніку беларуска-расійскага партнёрства ў галіне высокіх тэхналогій і ўключаны ў сусветны рэйтынг кампутарных сістэм.

**Экалогія** – 1) навука пра ўзаемадзеянні жывых арганізмаў і іх супольнасцяў паміж сабой і з навакольным асяроддзем; 2) часта пад экалагічнымі пытаннямі разумеюцца, перш за ўсё, пытанні аховы навакольнага асяроддзя.

## Гістарычныя асобы

**Алексіевіч С.** – беларуская пісьменніца, лаўрэат Нобелеўскай прэміі ў галіне літаратуры, аўтар кніг “У войны не женское лицо”, “Последние свидетели”, “Цинковые мальчики”, “Зачарованные смертью”, “Чернобыльская молитва”, “Последние свидетели. Соло для детского голоса” і “Время сэконд-хэнд”.

**Алфёраў Ж. І.** – лаўрэат Нобелеўскай прэміі па фізіцы, ураджэнец Беларусі. Яго адкрыцці ў галіне сучасных інфармацыйных тэхналогій, у прыватнасці, вынаходніцтва хуткіх транзістараў, лазерных дыёдаў, інтэгральных мікрасхем-“чыпаў”, дазволілі зрабіць звычайнымі такія рэчы, як прайгравальнік кампакт-дыскаў, пульт дыстанцыйнага кіравання, сонечныя батарэі, мабільныя тэлефоны. Ж. І. Алфёраў узнагароджаны ордэнам Ф. Скарыны, ганаровы грамадзянін г. Віцебска.

**Домрачава Д. –** беларуская біятланістка, трохразовая алімпійская чэмпіёнка 2014 г. у Сочы, уладальніца вялікага Крыштальнага глобуса Кубка свету па біятлоне (2014–2015 гг.), уладальніца 5 малых Крыштальных глобусаў Кубка свету па біятлоне, заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь. Самая тытулаваная беларуская спартсменка ў гісторыі зімовых Алімпійскіх гульняў. У дзень заваёвы трэцяга залатога медаля на Алімпійскіх гульнях – 2014 Дар'і было прысвоена званне "Герой Беларусі", яна стала першай у гісторыі краіны жанчынай і 11-й з тых беларусаў, якія былі ўдастоены ганаровай вышэйшай узнагароды з 1996 па 2015 г.

**Заяц Л. К.** – Міністр сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь з 2012 г.

**Кабякоў А. У. –** Прэм'ер-Міністр Рэспублікі Беларусь з 2014 г.

**Кішчанка А.** – беларускі мастак, аўтар «Габелену века», якому прысвоены статус гісторыка-культурнай спадчыны. На габелене адлюстравана звыш 80 вядомых палітыкаў і дзеячаў культуры XX ст. Ён быў вытканы ўручную на Барысаўскім камбінаце прыкладного мастацтва. Яго плошча складае 266 м², а вага – 286 кг. Габелен унесены ў кнігу рэкордаў Гінесу.

**Карват У. М.** – ваенны лётчык, якому ў 1996 г. першаму ў рэспубліцы прысвоена (пасмяротна) вышэйшая ступень адзнакі Рэспублікі Беларусь – Герой Беларусі. Цаной уласнага жыцця ён адвёў палаючы самалёт у бок ад в. Вялікае Гацішча Баранавіцкага раёна і тым захаваў жыццё многіх людзей. Герой Беларусі – вышэйшая воінская і працоўная ўзнагарода. Адным з першых яе ўдастоены старшыня Гродзенскага абласнога камітэта А. І. Дубко (пасмяротна).

**Лукашэнка А. Р.** – дзяржаўны дзеяч Рэспублікі Беларусь. У 1990–1994 гг. – дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. 10 ліпеня 1994 г. абраны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Галоўнакамандуючы Узброенымі сіламі Рэспублікі Беларусь, узначальвае Савет Бяспекі. У 2001, 2006, 2010 і 2015 гг. быў абраны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь на чарговы тэрмін. Паслядоўна прытрымліваецца курса эканамічнага і сацыяльнага развіцця краіны з мэтай умацавання беларускай дзяржаўнасці і паляпшэння дабрабыту народа.

**Пташук М. М.** – вядомы савецкі і беларускі кінарэжысёр. Народны артыст Беларускай ССР (1990). Яго рэжысёрскія працы: "Гульня ўяўлення" (1995), "У жніўні 44-га ..." (2001), "У чэрвені 41-га" (2003).

**Сакалоўскі Н.** – беларускі кампазітар, адзін з аўтараў Дзяржаўнага гімна БССР, існаваўшага з 1955 г.

**Фінберг М. Я.** – прафесар Беларускай акадэміі музыкі, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, народны артыст Рэспублікі Беларусь. Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях. Дырэктар – мастацкі кіраўнік дзяржаўнай установы "Нацыянальны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь".

## ПРЫКЛАДНЫЯ ПЫТАННІ ДА ЗАЛІКУ

1. Метадалагічныя асновы вывучэння гісторыі.
2. Перыядызацыя сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі.
3. Прадмет вывучэння гісторыі Беларусі ў кантэксце цывілізацыйнага развіцця агульнарускай і еўрапейскай гісторыі.
4. Гісторыяграфічныя школы і крыніцы вывучэння гісторыі Беларусі.
5. Найстаражытнае насельніцтва на тэрыторыі беларускіх зямель. Гісторыя засялення.
6. Станаўленне ранніх дзяржаўных утварэнняў на беларускіх землях. Кіеўская Русь. Полацкае і Тураўскае княствы і іх узаемаадносіны з Кіевам і Ноўгарадам.
7. Духоўнае жыццё беларускіх зямель у IX–XIII стст.
8. Эканамічныя і палітычныя фактары фарміравання беларускага этнасу і яго тэрыторыі. Фарміраванне беларускай народнасці (XIV–XVIII стст.). Паходжанне назвы Беларусь.
9. Асаблівасці складвання канфесійных адносін на тэрыторыі Беларусі ў XIV–XVIII стст. Роля праваслаўнай царквы ў кансалідацыі беларускага этнасу. Уплыў каталіцтва і ўніяцтва.
10. Асноўныя тэндэнцыі і дасягненні ў развіцці культуры Беларусі ў эпоху Адраджэння і Асветніцтва. Роля і месца беларускай культуры ў еўрапейскім культурна-цывілізацыйным працэсе (XIV–XVIII стст.)
11. Фарміраванне беларускай нацыі (XIX – пачатак XX стст.). Зараджэнне і развіццё беларусазнаўства. Тэорыя «заходнерусізму».
12. Ідэі беларускага нацыянальнага адраджэння ў пачатку XX ст. Роля газеты «Наша ніва» ў фарміраванні беларускай ідэі і абуджэнні нацыянальнай свядомасці.
13. Сярэднявечча і яго асноўныя рысы ў Еўропе.
14. Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Роля заходнерускіх зямель у працэсе дзяржаўнага будаўніцтва ВКЛ.
15. Асноўныя напрамкі знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага ў XIII–XVI стст.

16. Органы дзяржаўнай улады Вялікага Княства Літоўскага, іх эвалюцыя і функцыі. Статуты ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг.

17. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Вялікага Княства Літоўскага: сацыяльная структура, сельская гаспадарка і гарадское жыццё.

18. Асноўныя тэндэнцыі развіцця сусветнай гісторыі ў Новы час. Эканамічныя, палітычныя і культурныя змены ў Еўропе і свеце (XVI–XVII стст.).

19. Люблінская унія. Уваходжанне ВКЛ у склад Рэчы Паспалітай. Дзяржаўна-прававое становішча Вялікага Княства Літоўскага ў складзе аб'яднанай дзяржавы.

20. Войны XVII–XVIII стст. і іх наступствы для беларускіх зямель.

21. Узмацненне феадальнай анархіі і паглыбленне крызісу Рэчы Паспалітай. Падзелы яе тэрыторыі і ўключэнне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі.

22. Беларусь у складзе Расійскай імперыі ва ўмовах фарміравання індустрыяльнага грамадства. Асноўныя напрамкі палітыкі самадзяржаўя ў Беларусі.

23. Беларускія землі ў перыяд Айчыннай вайны 1812 г.

24. Расійскі шлях палітычнай і эканамічнай мадэрнізацыі. Адмена прыгоннага права. Рэформы 60–70-х гг. XIX ст. і асаблівасці іх здзяйснення на Беларусі.

25. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў другой палове XIX ст.

26. Грамадска-палітычныя рухі і аб'яднанні ў Беларусі. Паўстанне 1863–1864 гг. і яго ўплыў на палітыку ўладаў Беларусі і грамадска-палітычную думку.

27. Ідэалогія лібералізму, народніцкія і сацыял-дэмакратычныя плыні ў Расіі і Беларусі.

28. Узнікненне агульнарасійскіх і беларускіх партый і арганізацый. Стварэнне Беларускай сацыялістычнай грамады, яе праграмныя мэты і дзейнасць.

29. Рэвалюцыя 1905–1907 гг. і пачатак расійскага парламентарызму. Сталыпінская аграрная рэформа і асаблівасці яе здзяйснення на Беларусі.

30. Першая сусветная вайна і яе наступствы для Беларусі. Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. у Расіі і на Беларусі. Праблемы выбару шляхоў далейшага грамадскага развіцця.

31. Перамога Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Петраградзе і ў Беларусі. Роля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў гістарычным лёсе беларускага

народа. Устанаўленне савецкай улады ў Беларусі. Першыя рэвалюцыйныя пераўтварэнні.

32. Праблемы фарміравання беларускай дзяржаўнасці на нацыянальна-дэмакратычнай і рэвалюцыйна-класавай асновах пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі.

33. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі ва ўмовах герман-скай акупацыі.

34. Утварэнне беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове. Польска-савецкая вайна. Роля і месца БССР у складзе СССР.

35. Савецкая мадэль мадэрнізацыі грамадства. Усталяванне савецкай аднапартыйнай грамадска-палітычнай сістэмы ў БССР. Палітычныя рэпрэсіі 30-х гг. ХХ ст.

36. Шляхі і метады будаўніцтва індустрыяльнага грамадства ў савецкай Беларусі (НЭП, індустрыялізацыя, калектывізацыя).

37. Станаўленне беларускай савецкай культуры. Палітыка беларусізацыі. Дасягненні і супярэчнасці развіцця культуры і навукі ў 30-я гг. ХХ ст.

38. Геапалітычнае становішча Беларусі ў 20–30-я гг. ХХ ст. Беларускае пытанне пры афармленні Версальска-Вашынгтонскай сістэмы. Рыжская мірная дамова 1921 г. у гістарычным лёсе беларускага народа.

39. Грамадска-палітычнае, эканамічнае і нацыянальна-культурнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы.

40. Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі ў 20–30-я гг. ХХ ст.

41. Абвастрэнне супярэчнасцяў паміж вядучымі краінамі свету ў канцы 30-х гг. ХХ ст. Пачатак Другой сусветнай вайны. Аб’яднанне беларускага народа ў складзе БССР.

42. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі.

43. Устанаўленне фашысцкага акупацыйнага рэжыму ў Беларусі і яго мэты. Калабаранцкія арганізацыі і іх дзейнасць.

44. Партызанскі рух і падпольная барацьба ў Беларусі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

45. Вызначальныя перамогі Чырвонай Арміі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

46. Вынікі вайны для беларускага народа і яго ўклад у Перамогу над фашызмам. Захаванне памяці аб гераізме савецкага народа.

47. Геапалітычныя змены на міжнароднай арэне пасля другой сусветнай вайны. Супрацьборства дзвюх сацыяльна-палітычных сістэм.

48. Эканамічнае развіццё БССР у першае ваеннае дзесяцігоддзе. Правядзенне рэформаў у эканоміцы і іх вынікі (сярэдзіна 50-х – першая палова 80-х гг. XX ст.).

49. Спробы дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў СССР і БССР у другой палове 1950–1980-х гг.

50. Адукацыя, навука і культура БССР у пасляваенны перыяд: дасягненні і праблемы. Дзяржаўная рэлігійная палітыка і становішча канфесій.

51. Палітыка перабудовы, курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця.

52. Крызіс савецкага федэралізму. Абвяшчэнне Рэспублікі Беларусь. Распад СССР і ўтварэнне СНД.

53. Заканадаўча-прававое афармленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. Рэспубліканскія рэферэндумы 1995, 1996 і 2004 гг. і іх вынікі.

54. Геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь ва ўмовах сусветных глабалізацыйных працэсаў. Стратэгія і прынцыпы знешняй палітыкі Беларусі, яе шматвектарнасць на мяжы XX–XXI стст.

55. Беларуска-расійскія адносіны, стварэнне Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі: гісторыя і сучаснасць.

56. Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага інавацыйнага развіц-ця Рэспублікі Беларусь. Дасягненні і праблемы беларускай эканомікі.

57. Духоўнае і культурнае жыццё беларускага народа на мяжы XX–XXI стст.

## ЛІТАРАТУРА

### Нарматыўна-прававыя дакументы

1. Декларация Верховного Совета Республики Беларусь "О государственном суверенитете Белорусской Советской Социалистической Республики" от 27 июля 1990 г. // Ведомости Верховного Совета Республики Беларусь. – 1991. – № 31. – Ст. 356.

2. Конституция Республики Беларусь 1994 г. (с изменениями и дополнениями, принятыми на республиканских референдумах 24 ноября 1996 г. и 17 октября 2004 г.). – 2-е изд. / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2007. – 64 с.

3. Концепция программы социально-экономического развития Республики Беларусь на 2016–2020 гг. // Беларусь сегодня. – 2015. – 11 марта. – С. 1.

4. Мир и развитие. Послание Президента А. Г. Лукашенко белорусскому народу и Национальному собранию // Беларусь сегодня. – 2015. – 30 апр. – С. 2–4.

5. Обновление страны – путь к успеху и процветанию. Послание Президента А. Г. Лукашенко белорусскому народу и Национальному собранию // Беларусь сегодня. – 2013. – 20 апр. – С. 2–4.

6. Сильная экономика и честная власть – фундамент независимости страны и процветания нации. Послание Президента А. Г. Лукашенко белорусскому народу и Национальному собранию // Беларусь сегодня. – 2014. – 23 апр. – С. 2–4.

### Падручнікі і вучэбныя дапаможнікі

7. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапаможнік / А. А. Каваленя [і інш.]; пад рэд. А. А. Кавалені, М. С. Сташкевіча. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2004. – 279 с.

8. Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі: дапаможнік / У. А. Сосна [і інш.]; пад рэд. Л. В. Лойкі. – Мінск: РІВШ, 2005. – 333 с.

9. Гісторыя Беларусі: падручнік: у 2 ч. / Я. К. Новік [і інш.]; пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – 3-е выд., дапрац. і дап. – Мінск: Вышэйш. шк., 2007. – Ч. 1: Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. – 398 с.

10. Гісторыя Беларусі: падручнік: у 2 ч. / Я. К. Новік [і інш.]; пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – 3-е выд., дапрац. і дап. – Мінск: Вышэйш. шк., 2007. – Ч. 2: Люты 1917–2006 гг. – 445 с.

11. Новік, Я. К. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў – па 2008 г.: вучэб. дапаможнік / Я. К. Новік, І. Л. Качалаў, Н. Я. Новік; пад рэд. Я. К. Новіка. – 2-е выд. – Мінск: Вышэйш. шк., 2010. – 512 с.

12. Чигринов, П. Г. Очерки истории Беларуси: учеб. пособие / П. Г. Чигринов. – 2-е изд., перераб. и доп. – Минск: Вышэйш. шк., 2005. – 463 с.

### Дадатковая літаратура

13. Бабосов, Е. Заразительный пример интеграции / Е. Бабосов // Беларуская думка. – 2012. – № 5. – С. 43–47.

14. Вялікае Княства Літоўскае. Энцыклапедыя: у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2005. – Т. 1. – 688 с.

15. Глушакова, Н. А. Гісторыя Беларусі ў табліцах і схемах: матэрыялы для самастойнай працы / Н. А. Глушакова. – Горкі: БДСГА, 2013. – 144 с.

16. Глушакова, Н. А. Станаўленне і развіццё суверэннай Рэспублікі Беларусь (1991–2010 гг.): матэрыялы для самастойнай працы / Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія; скл. Н. А. Глушакова. – Горкі, 2011. – 88 с.

17. Гусаков, В. Г. На основе интеллектуального капитала / В. Г. Гусаков // Беларуская думка. – 2015. – № 9. – С. 76–85.

18. Дмитрачков, П. К вопросу о Люблинской унии и образовании Речи Посполитой / П. Дмитрачков // Беларуская думка. – 2006. – № 6. – С. 139–148.

19. Ермаловіч, М. Па слядах аднаго міфа / М. Ермаловіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 2001. – 98 с.

20. Каханоўскі, А. Адмена прыгоннага права на тэрыторыі Беларусі, ход рэформы, яе наступствы і значэнне / А. Каханоўскі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2011. – № 10. – С. 10–16.

21. Ковалёв, М. Евразийский союз и стратегия экономической модернизации / Ковалёв, Е. Господарик, С. Пасиков // Беларуская думка. – 2012. – № 3. – С. 13–23.

22. Котович, О. Золотые правила народной культуры / О. Котович, Я. Крук. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2013. – 592 с.

23. Культура Беларусі. Ад старажытных часоў па 2010 год: матэрыялы для самастойнай працы / Н. А. Глушакова [і інш.]. – Горкі: БДСГА, 2011. – 104 с.

24. Лаврова, О. И. Спрос на инновации / О. И. Лаврова // Беларуская думка. – 2014. – № 6. – С. 86–92.

25. Мазец, В. На шляху да незалежнасці. Змены ў нацыянальна-культурным жыцці БССР у 1985–1991 гг. / В. Мазец // Беларускі гістарычны часопіс. – 2011. – № 8. – С. 12–21.

26. Макей, В. В. Внешняя политика на службе народа / В. В. Макей // Беларуская думка. – 2015. – № 9. – С. 28–36.

27. Михайловская, С. ЕАЭС против монополий и недобросовестной конкуренции / С. Михайловская // Беларуская думка. – 2015. – № 8. – С. 16–21.

28. Мысліцелі і асветнікі Беларусі: энцыкл. даведнік / гал. рэд. Б. І. Сачанка [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1995. – 671 с.

29. Мясникович, М. В. Объединяющая идея – мир и согласие / М. В. Мясникович // Беларуская думка. – 2015. – № 9. – С. 4–10.

30. Рапота, Г. А. Союзное строительство: взгляд в будущее / Г. А. Рапота // Беларуская думка. – 2015. – № 9. – С. 11–13.

31. Рубинов, А. Н. Путь стабильности и порядка / А. Н. Рубинов // Беларуская думка. – 2015. – № 9. – С. 14–19.

32. Русакович, А. СНГ: от Вискулей до наших дней / А. Русакович // Беларуская думка. – 2012. – № 2. – С. 32–41.

33. Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588. Тэксты. Давед. Камент. / гал. рэд. І. П. Шамякін. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 573 с.

34. Сташевич, Н. Формирование идеи белорусской государственности в конце XIX века / Н. Сташевич // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2007. – № 7. – С. 3–11.

35. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / гал. рэд. Г. П. Пашкоў. – Мінск: БелЭн, 1993–2003. – 6 т.

ЗМЕСТ

Прадмова.....……………………………………………………………………… 3
Арганізацыя самастойнай працы студэнтаў…………………………………………... 5
Т э м а 1. Вялікае Княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае (другая палова XIII – першая палова XVI стст.)……………………………………………………………… 7
Т э м а 2. Савецкая грамадска-палітычная сістэма ў Беларусі (кастрычнік 1917 – чэрвень 1941 гг.)……………………………………………………………………… 23
Т э м а 3. Суверэнная Рэспубліка Беларусь ва ўмовах глабалізацыі сусветных працэсаў………………………………………………………………….. 41
Прыкладныя пытанні да заліку…………………………………………………….. 58
Літаратура……………………………………………………………………………. 62